У планах гаспадарчых судоў Беларусі — паступовы пераход да «электроннага правасуддзя». Гэта значыць, што падаць іск можна будзе па інтэрнэце.

СТАР 2

Хто павінен ствараць утульнасць і прыгажосць, наводзіць «лоск», падтрымліваць чысціню? Як заахвоціць і адказных асоб, і звычайных грамадзян сачыць за «парадкам у доме» — не толькі ўнутраным, але і вонкавым?

Паказ беларускіх калекцый ніжняй бялізны ў межах бізнэс-сустрэчы вядучых сучасных айчынных вытворцаў з прадстаўнікамі міжнароднага рынку прайшоў у гарналыжным комплексе «Лагойск».

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 КРАСАВІКА 2012 г. СЕРАДА № 75 (27190) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

У ПОЛАЦКУ БУДЗЕ РАЭЛІЗАВАНЫ ПРАЕКТ ПА СТВАРЭННІ ТУРЫСТЫЧНАЙ ІНФРАСТРУКТУРЫ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 17 красавіка прыняў з дакладам старшыню Віцебскага абл-выканкама Аляксандра Косінца, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Губернатар праінфармаваў аб сацыяльна-эканамічным развіцці Віцебскай вобласці за першы квартал, ходзе веснавых палявых работ.

Паводле слоў Аляксандра Косінца, выкананы практычна ўсе прагнозныя паказчыкі. У прыватнасці, тэмп росту валавога рэгіянальнага прадукту дасягнуў 121 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года, індэкс фізічнага аб'ёму выпуску прадукцыі вытворчасці — 136 працэнтаў. Экспарт у прадпрыемстваў камунальнай уласнасці без уліку нафты і нафтапрадуктаў за студзень-люты павялічыўся ў 6 разоў, ужо выканана гадавое заданне па гэтым паказчыку. Сальда знешняга гандлю за першы квартал з'яўляецца дадатным і папярэдне ацэньваецца ў памеры $687 млн. пры гадавым заданні $290 млн.

Кіраўнік дзяржавы пазітыўна ацаніў тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці ў першым квартале, запатрабаваў не зніжаць іх у другім квартале і да чэрвеня дасягнуць сярэдняй зарплаты ў рэгіёне ў эквіваленце амаль $400.

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на неабходнасці інтэнсіфікаваць работу аграпрамысловага комплексу з улікам умоў надвор'я і завяршыць веснавыя палявыя работы, сяўбу яравых у рэгіёне да 8 мая.

На сустрэчы размова ішла таксама аб новай канцэпцыі развіцця Полацка, у прыватнасці, стварэнні культурна-гістарычнага цэнтра і турыстычнай інфраструктуры вакол Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, Сафійскага сабора. Тэрыторыі, прылеглыя да гэтых галоўных духоўных святынь Беларусі, павінны поўнасцю пераўтварыцца.

Паводле слоў губернатара, які прадставіў праект, агульны яго кошт ацэньваецца ў Br2 трлн. Для рэалізацыі плануецца прыцягнуць сродкі інвестара.

Як расказаў Аляксандр Косінец, праектам прадугледжваецца рэканструкцыя многіх гарадскіх аб'ектаў, будаўніцтва гасцініц, выставачных цэнтраў, аднаўленне сцежкі святой Ефрасінні ўздоўж ракі Палаты, якая стане суднаходнай, абсталяванне зон адпачынку, узвядзенне рэстаранаў, кафэ.

Такім чынам, плануецца зрабіць усё неабходнае для таго, каб Полацк стаў буйным гісторыка-культурным цэнтрам, які будзе прывабным для турыстаў. Паводле слоў губернатара, праект плануецца завяршыць у 2015 годзе.

Кіраўнік дзяржавы адобрыў прапанаваную канцэпцыю і даручыў падрыхтаваць праект адпаведнага ўказа.

Уладзімір МАКЕЙ:

«Паслы змогуць вярнуцца, калі ў ЕС прыйдуць да разумення неабходнасці дыялогу з Беларуссю»

17 красавіка кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей даў інтэрв'ю беларускім СМІ.

У ходзе інтэрв'ю прагучала пытанне: «У СМІ з'явілася цяпер шмат заяў аб тым, што, выпусціўшы двух апазіцыйных дзеячаў, асуджаных за арганізацыю масавых беспарадкаў у снежні 2010 года, беларуская ўлада хоча тым самым стварыць умовы для таго, каб паслы Еўрасаюза вярнуліся ў Мінск. Як вы можаце гэта пракаментаваць?»

— Ніяк. Гэта поўны абсурд. Гэта дзве вялікія розніцы, як гавораць у Адэсе. Пытанне вызвалення зняволеных за канкрэтныя злачынствы ляжыць выключна ў сферы кампетэнцыі кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт у свой час дакладна заявіў: раскаюцца людзі, напішуць адпаведныя прашэнні аб памілаванні — яны будуць разгледжаны ва ўстаноўленым законам парадку. Што і адбылося. І Прэзідэнт дакладна паказаў сваю паслядоўнасць.

А вось пытанне вяртання паслоў — гэта ўжо з іншай оперы. Еўрасаюз у свой час сам адклікаў сваіх паслоў, і сёння рэальнасць такая, што не мы просім, а Еўрасаюз просіць нас дазволіць паслам вярнуцца ў Беларусь. І не толькі просіць, а патрабуе і нават пагражае новымі санкцыямі. Наша пазіцыя наконт гэтага вядомая. Мы не з'яўляемся ні ў якой меры прыхільнікамі эскалацыі напружанасці. Наадварот, мы заявілі аб тым, што гатовы да дыялогу з Еўрасаюзам на ўсіх узроўнях, але што датычыцца вяртання паслоў, то мы лічым, што яны павінны вярнуцца тады, калі для гэтага будуць адпаведныя ўмовы. А менавіта — калі ў Еўрасаюзе ўсвядомяць памылковасць палітыкі шантажу, дыктату, санкцый у адносінах да Рэспублікі Беларусь і прыйдуць да разумення неабходнасці дыялогу з Беларуссю.

СТАР. 2

■ Сёння — Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РАМАНТЫКІ АДКРЫЦЦЯ

СУПРАЦЬ СНУ ЗАБЫЦЦЯ

СОН: Баль прызначаны ў тых самых чырвоных сценах, што стаяць на краі горада, самае месца збірацца ды танчыць. Але свята не атрымліваецца: вокны вітаюць чорнымі дзіркамі, у сценах гуляе вецер, гудзе і гудзе, толькі палохае з'яўленнем злосных крывасмокаў, што прытаіліся ў кутках запусцення. І дзе тая чароўная фея, што здольная ператварыць у святло зіхацення і бляск шыкоўнасці змрочны закінуты будынак?..

АБУДЖЭННЕ: У дзяцінстве мы хадзілі гуляць да руін, якія вярэдзілі думкі. Днём яны падаваліся неверагодна прыгожымі ў сваёй таямнічасці і распальвалі ўяўленне пра тое, як магло б ісці жыццё тут, калі б не было дзесяцігоддзяў забыцця пра стагоддзі стварэння. Каб не расцягвалі старажытную цэглу месцічы, не пазіралі спакойна на тое, як сыходзяць у нябыт цэлыя стагоддзі, руйнуючы разам са сценамі свядомасць людзей, якія так і не здолелі стаць гаспадарамі таго, што стала ім належаць. А мы, малыя, хадзілі і думалі: вось калі вырасцем — то да таго часу ўсё навокал зменіцца, і мы праз чароўную браму з барочнымі аздабленнямі будзем прыязджаць сюды на свой сапраўдны баль... Я дагэтуль мару пра баль у гістарычных сценах свайго дзяцінства. Праўда, ужо ведаю, што ніякай чароўнай феі няма. Насамрэч самай чароўнай сілай валодае сам чалавек, які можа і ператвараць, і аднаўляць, і нават ажыўляць — спачатку сваю ўласную свядомасць, а потым і іншых, каб была магчымасць зразумець: багацце там, дзе ты ў гэты момант стаіш.

Думала пра гэта падчас размоў краязнаўцаў, якія напярэдадні Міжнароднага дня помнікаў сабраліся ў Нацыянальным гістарычным музеі, каб абмеркаваць падыходы, якія дапамагаюць ствараць чараўніцтва: яны, падобна лекарам, здольныя выводзіць людзей (ці нават народ) са сну забыцця, які, здаецца, часам балансуе на мяжы комы. Сітуацыя такая, што добрых і правільных слоў гучыць шмат, але адзінкам удаецца дастукацца да самых глыбінь свядомасці. Проста яны любяць тое, пра што гавораць. І здольныя мяняць наш беларускі свет, абуджаючы грамадства да элементарнай неабыякавасці.

Час выбраў нас

І ёсць вынікі. Грамадскасць дамаглася, каб змяніла аблічча адна з вежаў Нясвіжскага палаца — людзі на гэта былі гатовыя ахвяраваць грошы. Грамадскасць, дзякуючы мэтанакіраванай працы краязнаўцаў па папулярызацыі гісторыі, адстойвала будынкі, якім пагражала знішчэнне. Грамадскасць звяртае ўвагу на тое, ці правільна вядуцца работы па рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і гатовая нават дапамагаць дзяржаве ў аднаўленні канкрэтных аб'ектаў — ды хоць праз працу тых жа валанцёраў. Не дзіва, што сустрэча краязнаўцаў была падтрымана Міністэрствам культуры.

СТАР. 4

■ На слыху

ПЕРАМОЎ АБ УВЯДЗЕННІ РАСІЙСКАГА РУБЛЯ НЯМА

Нацыянальны банк Беларусі адрэагаваў на ажыўленне дыскусій ў грамадстве наконт увядзення расійскага рубля ў якасці адзінага плацежнага сродку ў Беларусі, распаўсюдзіўшы тлумачэнні па гэтым пытанні.

Галоўны банк краіны сцвярджае, што Беларусь і Расія пастаянна прапрацоўваюць магчымасці пашырэння выкарыстання расійскага рубля, як і беларускага, ва ўзаемных разліках паміж суб'ектамі гаспадарання. Але ж мэтазгоднасць стварэння саюзнай валюты ў значнай ступені залежыць ад канкрэтных дамоўленасцяў і ўмоў рэалізацыі агульнаэканамічнай і грашова-крэдытнай палітыкі. Таму пазіцыя нашага Нацыянальнага банка такая: першапачатковая задача зараз — далейшае ўмацаванне фінансавай стабільнасці ў эканоміцы. А ўвядзенне ў абарачэнне замежнай валюты (ці то расійскага рубля, ці то долара, ці то еўра) не вырашыць пытання ўмацавання макраэканамічнай стабільнасці. Пераход да выкарыстання замежнай валюты будзе азначаць фактычную адмову ад правядзення незалежнай грашова-крэдытнай палітыкі. Ад гэтага знізяцца магчымасці краіны для рэагавання на эканамічныя шокі: захадаў бюджэтна-падатковай палітыкі без манетарных інструментаў можа не хапіць. А тут недалёка да замаруджвання эканамічнага росту і павелічэння беспрацоўя.

Нацбанк адзначае, што перамовы па пытанні выкарыстання расійскага рубля на тэрыторыі Беларусі ў цяперашні час не вядуцца. Падкрэсліваецца, што стварэнне валютнага саюза і ўвядзенне адзінай валюты павінна адпавядаць інтарэсам абедзвюх дзяржаў. Такі крок можа стаць толькі лагічным заканчэннем інтэграцыі краін пасля паўназначнага завяршэння фарміравання зоны свабоднага гандлю, мытнага саюза і адзінай эканамічнай прасторы.

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына ЛЯПАРСКАЯ, галоўны трэнер зборнай Беларусі па мастацкай гімнастыцы:

«Алімпійскія гульні — самыя блізкія да Бога з усіх спаборніцтваў. Тут складаней за ўсё што-небудзь прагназаваць, і жыццё не раз гэта даказала. На Алімпіядах здараецца больш за ўсё нечаканасцяў, тут часта бываюць сюрпрызы... Тым не менш мы рыхтуемся змагацца за самыя высокія месцы».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.04.2012 г.

Долар ЗША	8010,00	■
Еўра	10520,00	▲
Рас. руб.	270,50	▲
Укр. грыўня	998,45	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 12°
Віцебск	+ 11°
Гомель	+ 12°
Гродна	+ 11°
Магілёў	+ 12°
Мінск	+ 10°

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

18 красавіка 2012 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі **(вул. Чырвонаармейская, 4)** адбудзецца **пасяджэнне восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання**.

БЕЛИНВЕСТБАНК

www.belinvestbank.by

сообщает, что очередным (годовым) общим Собранием акционеров банка от 27 марта 2012 г. принято решение о выплате дивидендов по простым (обыкновенным) и привилегированным акциям банка за 2011 год из расчета 8 рублей на одну акцию. Выплата дивидендов будет осуществляться 25 апреля 2012 г.

Дивиденды будут выплачиваться с 25 апреля 2012 г. в Главном операционном управлении (г. Минск, пр-т Машерова, 29), филиалах, дирекциях и иных структурных подразделениях, не имеющих баланса, созданных Банком (филиалом):

- юридическим лицам – в безналичном порядке;
- физическим лицам – в безналичном порядке либо наличными денежными средствами при предъявлении документа, удостоверяющего личность.

Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, сформирован на основании реестра владельцев акций банка по состоянию на 22 февраля 2012 г.

Справки по телефонам:
(8 017) 239 02 88, 239 02 54, 239 01 42.

Открытое акционерное общество
«Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк»
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3,
выдана Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 2006 г.

ВЯЛІКАЯ ВАДА

У васьмі населеных пунктах Гомельшчыны паводкавая і талая вада застаецца на падворках грамадзян. Пад яе ўладай зараз зямля 63 прыватныя гаспадаркі, 6 сельскагаспадарчых пабудоў і 4 дачныя дамкі. Узровень вады ў Сажы ля Гомеля склаў 460 см — за суткі дадалося 8 см. Прытым, што небяспечна высокі ўзровень складае 515 см.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АБРАНЫ НОВЫ ДЫРЭКТАР СУСВЕТНАГА БАНКА

Прэзідэнт Дармуцкага каледжа Джым Ен Кім стаў у панядзелак новым кіраўніком Сусветнага банка. Такое рашэнне прыняў савет дырэктараў СБ, які спыніўся на кандыдатуры Кіма, прапанаванай Злучанымі Штатамі. Цяперашні кіраўнік Сусветнага банка Роберт Зэлік пакіне свой пост 30 чэрвеня па завяршэнні пяцігадовага тэрміну знаходжання на пасадзе. Варта адзначыць, што па традыцыі, якая склалася за гады пасля Другой сусветнай вайны, кіраўніком Сусветнага банка заўсёды становіцца грамадзянін ЗША. А вось іншую буйную міжнародную фінансавую арганізацыю — Міжнародны валютны фонд — заўсёды ўзначальваў выхадзец з адной з еўрапейскіх краін.

У РАСІІ ПЕРАСТАЛІ ВЫПУСКАЦЬ «СЯМЁРКУ»

З канвеера Іжэўскага аўтамабільнага завода ў аўторак, 17 красавіка, сышоў апошні аўтамабіль Lada 2107, паведамляецца на сайце «Іжаўта». Да канца 2012 года на іжэўскім заводзе спыніцца выпуск апошняй «класічнай» мадэлі «Аўтаваза» — універсала Lada 2104. Ужо са жніўня 2012 года «Іжаўта» зоймецца зборкай новай мадэлі — Lada Granta. Як тлумачылі раней на «Аўтавазе», спыніць вытворчасць «сямёркі» вырашылі ў сувязі з нізкім узроўнем продажу. Вытворчасць ВАЗ 2107 пачалася ў 1982 годзе на базе «пяцёркі» (ВАЗ 2105).

КАНДЫДАТА Ў ПРЭЗІДЭНТЫ ДЗЕЎБАНУЎ ПІНГВІН

Былога спікера палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША і цяперашняга кандыдата ў прэзідэнты краіны Ньюта Гінгрыча дзеўбануў пінгвін. Інцыдэнт адбыўся некалькі дзён таму падчас візіту палітыка ў Сент-Луіс, дзе ў яго было запланавана выступленне на штогадовай сустрэчы прадстаўнікоў Нацыянальнай стралковай асацыяцыі. Палітык не атрымаў сур'ёзных пашкоджанняў, аднак палец давялося перабінтаваць, каб спыніць кроў. Магеланавыя пінгвіны дасягаюць 80 сантыметраў у вышыню і важаць прыкладна пяць-шэсць кілаграмаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

НАЗВАНЫЯ ЛАЎРЭАТЫ ПУЛІТЦЭРАЎСКАЙ ПРЭМІІ

Лаўрэаты Пулітцэраўскай прэміі — самай прэстыжнай амерыканскай узнагароды ў галіне журналістыкі — былі абвешчаны ў Нью-Ёрку. Пераможцамі ў катэгорыі «Лепшае журналісцкае расследаванне» сталі інфармацыйнае агенцтва Associated Press і газета «The Seattle Times».

Карэспандэнты АР атрымалі прэстыжную ўзнагароду за правядзенне ўласнага расследавання. Падчас работ высветлілася, што ў рамках барацьбы з тэрарызмам паліцыя Нью-Ёрка на працягу некалькіх гадоў вяла масавае назіранне за мусульманамі найбуйнейшага амерыканскага мегаполіса. «The Seattle Times», у сваю чаргу, атрымала прэмію за серыю рэпартажаў аб выпадковай перадазіроўцы метадонам сярод пацыентаў з хранічнымі захворваннямі. Адна з найстарэйшых у ЗША штодзённых газет «Philadelphia Inquirer» атрымала ўзнагароду ў прэстыжнай катэгорыі «За служэнне грамадству» за матэрыялы аб гвалце ў гарадскіх школах. Свой першы «Пулітцэр» — у намінацыі «Лепшы нацыянальны рэпартаж» — атрымала інтэрнэт-газета «The Huffington Post» за серыю артыкулаў аб праблемах амерыканскіх ветэранаў, якія атрымалі раненні ў Іраку і Афганістане. Уплывовую газету «The New York Times» ушанавалі адразу ў дзвюх катэгорыях — «Рэпартаж, які тлумачыць» і «Міжнародны рэпартаж». У 2011 годзе прэмію атрымаў шэф маскоўскага бюро The New York Times Леві Кліфард за артыкулы аб становішчы спраў у сістэме правасуддзя Расіі.

КАРАТКА

У Беларусі павышаны закупачныя цэны на малако і свіней. Фактычна ўстаноўленыя ў рэгіёнах закупачныя цэны ў сярэднім павялічаны з улікам падаражання выкарыстоўваемых рэсурсаў: на малако — на 3,6 працэнта, на буйную рагатую жывёлу — на 17,6 працэнта, на свіней — на 20,5 працэнта.

Банкі Беларусі актывізуюць выдачу грамадзянам іпатэчных крэдытаў на жыллё пасля прыняцця Жыллёвага кодэкса краіны. Такое меркаванне выказала старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Галіна Палянская. «Жыллёвы кодэкс урэгулюе пазіцыю закона аб іпатэцы, якая прадаставіць банкам магчымасць адчужаць кватэру, калі чалавек сістэматычна не плаціць па іпатэчным крэдыце, — паведаміла парламентарый. Што датычыцца самога закона аб іпатэцы, то цяпер змяненні і дапаўненні ў гэты дакумент, якія датычацца работы закладных, знаходзяцца на разглядзе ў Палаце прадстаўнікоў.

У Беларусі днямі будзе праходзіць фэст экскурсаводаў. Бясплатныя экскурсіі ладзяцца больш чым у 20 гарадах. А ЦІ ГАТОВЫ ПРОСТЫЯ ГАРАДЖАНЕ ПАСПРАБАВАЦЬ СЯБЕ Ў РОЛІ ЭКСКУРСАВОДАЎ? КУДЫ НАЙПЕРШ ЯНЫ ПАВЯДУЦЬ ГАСЦЕЙ? З такімі пытаннямі мы звярнуліся да жыхароў Віцебска.

Алімпіяда КРОМСКАЯ, пенсіянерка:

— Калі да мяне прыязджаюць госці, я іх ваджу па цэнтры, паказваю Успенскі сабор — гэта вельмі прыгожы, велічны храм. Паказваю таксама Благавешчанскую царкву. Цудоўна, што яе аднавілі. Побач і драўляная царква Аляксандра Неўскага. Можна прайсці на бераг Дзвіны, дзе аднавілі саляныя склады. Зараз тут знаходзіцца культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо горада Віцебска». Я хоць і карэнная жыхарка Віцебска і працавала тут участковым урачом, ведала ўвесь горад, мне давялося адкрываць яго для сябе наноў. Я доўга жыла за межамі Беларусі: у мяне муж ваенны. І дзе б ні была, мне заўсёды хацелася вярнуцца менавіта ў сваё «роднае гняздо». І я радуюся, што нарэшце гэта адбылося. Віцебск увесь абнавіўся. У нас вельмі прыгожы тэатр, добра, што ў нас ёсць і філармонія... Наш горад вельмі ўтульны, тут ёсць, што паглядзець.

Анастасія КАРАСЬКО, адміністратар КУП «Турыстычна-гасцінічны комплекс «Віцебск Атэль»:

— Кожнаму беларусу варта прыехаць у наш старажытны горад, а таксама ў Полацк, наведаць цэрквы і музеі. Тур-групы якраз часта едуць з экскурсіямі менавіта ў два гэтыя гарады. Безумоўна, усім, хто прыязджае ў наш горад, варта параіць паглядзець Дом-музей Марка Шагала і Арт-цэнтр, дзе выстаўлены яго работы. Моладзь заўсёды цікавіцца, дзе можна павесяліцца, тады я прапаную ім клуб «Энергія». Многія хочуць паглядзець на Летні амфітэатр. Варта завітаць у выставачную залу «Духаўскі круглік», дзе можна даведацца пра гісторыю Віцебска (і, у прыватнасці, «Славянскага базара»). Да нас прыязджае шмат гасцей, асабліва летам. Мы жывём у прадчуванні свята, рыхтуемся да яго. Таму тут асаблівая атмасфера. А вось не хапае ў нас вялікіх зялёных зон, паркаў.

Вольга КІРЫЛАВА, навуковы супрацоўнік кластара касмічных тэхналогій, інавацыйнага цэнтра «Сколкава»:

— Турыстам трэба завітаць у Дом-музей Шагала, можна зайсці ў Ратушу, наведаць мастацкі музей. Варта паглядзець храмы, па цэнтры пагуляць. Калі нашы госці яшчэ не бачылі Летняга амфітэатра, вядзём іх да яго. Калі добрае надвор'е, прапаноўваем гасцям прыгарадныя базы адпачынку, вязём у сядзібу Рэпіна. Можна адзначыць, што наш горад старэйшы за Маскву. Трэба сказаць, што ў Віцебску вельмі чыста і ўтульна. Тут камфортна жыць і прыемна прымаць гасцей.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

■ Афіцыйна

ПАСЛАННЕ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСКАМУ НАРОДУ І ПАРЛАМЕНТУ ПЕРАНЕСЕНА З 19 КРАСАВІКА НА БОЛЬШ ПОЗНІ ТЭРМІН

Як паведаміў карэспандэнту БЕЛТА кіраўнік прэс-службы Прэзідэнта Беларусі Павел Лёгкі, кіраўнік дзяржавы адхіліў праект Паслання, падрыхтаваны дзяржаўнымі органамі, і адправіў яго на дапрацоўку.

Прэзідэнт даручыў перапрацаваць шэраг палажэнняў Паслання, якія датычацца, у прыватнасці, пытанняў прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці, а таксама знешнепалітычнага курсу краіны.

Кіраўнік дзяржавы даручыў улічыць у праекце Паслання шэраг прынцыповых момантаў: недапушчальнасці залішне ліберальнага падыходу пры продажы дзяржаўнай уласнасці, катэгарычнай непрымальнасці так званай агульнай прыватызацыі, а таксама абавязковай і ўсёабдымнай абароны інтарэсаў простых работнікаў і ўсіх радавых грамадзян Беларусі ў ходзе магчымай прыватызацыі прадпрыемстваў.

У частцы, якая датычыцца знешнепалітычных падыходаў, кіраўнік дзяржавы выказаўся супраць залішне жорсткіх захадаў рэагавання на ўзнікаючыя праблемы ва ўзаемаадносінах Беларусі са сваімі партнёрамі.

Нядаўна ў Прэзідэнта краіны адбыліся пашыраныя нарады па пытаннях прыватызацыі, а таксама знешняй палітыкі, падчас якіх кіраўніком дзяржавы быў зроблены шэраг прынцыповых заяў.

«Паслы змогуць вярнуцца, калі ў ЕС прыйдуць да разумення неабходнасці дыялогу з Беларуссю»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што сёння адбываецца? Сёння выстаўляюцца новыя патрабаванні. Гавораць, што засталося паўтара або два дзясяткі нейкіх палітычных зняволеных, якіх, цытую, «трэба неадкладна вызваліць, неадкладна рэабілітаваць». У гэты спіс уключылі нават радыкальных рэвалюцыянераў-анархістаў, якія закідалі расійскае пасольства бутэлькамі з запальнай сумессю, кактэйлямі Молатава. Паводле інтэрпрэтацыі Еўрасаюза, заўтра гэты спіс можа разрасціся і да 50-60 чалавек. Таму такія патрабаванні — гэта шлях нікуды. Ніякага вызвалення пад націскам не будзе. Ніякай рэабілітацыі па еўрасаюзаўскаму загаду — таксама не будзе. Гэта ўсе павінны добра разумець. Але нават тыя ж самыя адпушчаныя былыя зняволеныя ў сваіх хадайніцтвах чорным па белым напісалі аб прызнанні сваёй віны і аб раскаянні.

Таму вяртанне паслоў у Беларусь магчыма тады, калі, паўтаруся, у Еўрасаюзе прыйдуць да разумення неабходнасці размовы з Беларуссю аб адмене санкцый, а самі паслы, калі яны маюць намер вярнуцца, будуць гатовы размаўляць не на мове шантажу і пагроз, а на мове дыялогу, як таго патрабуюць адпаведныя канвенцыі аб дыпламатычных кантактах.

■

СЁЛЕТА Ў КРАІНЕ ПАБУДАВАНА 17,3 ТЫСЯЧЫ НОВЫХ КВАТЭР

Як паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце Беларусі, за першы квартал 2012 года на будаўніцтва жылля было выкарыстана 4,367 трлн рублёў інвестыцый у асноўны капітал.

Тут трэба адзначыць, што пераважнымі крыніцамі фінансавання жыллёвага будаўніцтва ўпершыню за апошнія гады сталі ўласныя сродкі насельніцтва (49,6% гэтых інвестыцый), а аб'ёмы крэдытаў банкаў складаюць 34,6%.

Усяго за першыя тры месяцы сёлета арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці было пабудавана 17,3 тысячы новых кватэр (летась за першы квартал — 16 тысяч). За гэты час уведзена ў эксплуатацыю 1 млн 344,4 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, што складае 32% да гадавога задання.

Больш за ўсё ў першым квартале было пабудавана жылля ў Мінскай вобласці — 351,1 тысячы квадратных метраў жылля, на другім месцы — Брэсцкая вобласць (269,2 тыс. кв. м), потым г. Мінск (193,1 тыс. кв. м), Гродзенская вобласць (184,8 тыс. кв. м), Гомельская (125,6 тыс.), Віцебская (118,8 тыс.) і Магілёўская вобласць (101,8 тыс. кв. м).

Для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 840,3 тысячы квадратных метраў, што складае 62,5% ад агульнага аб'ёму пабудаванага жылля. У параўнанні з першым кварталам 2011 года, сёлета для чаргавікоў пабудавана на 16,8 тысячы квадратных метраў жылля больш.

Спецыялісты Белстата адзначаюць, што сёлета для чаргавікоў было пабудавана 782,6 тысячы квадратных метраў жылля з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі.

Сяргей КУРКАЧ.

ЧЫГУНАЧНІКІ ЧАТЫРОХ КРАІН — АМАТАРАМ ФУТБОЛА

Прадстаўнікі чыгуначных адміністрацый і перавозчыкаў Беларусі, Польшчы, Расіі і Украіны падпісалі мемарандум аб узаемадзеянні ў арганізацыі транспартнага забеспячэння чэмпіянату Еўропы па футболе Еўра-2012.

Удзел Беларускай чыгункі ў забеспячэнні гэтых перавозак абумоўлены гульнямі зборнай Расіі ў матчах чэмпіянату, якія пройдуць у Польшчы. Як паведамілі ў прэс-службе магістралі, згодна з мемарандумам, бакі дамовіліся арганізоўваць дадатковыя цягнікі для перавозкі балельшчыкаў паміж гарадамі Беларусі, Польшчы, Расіі і Украіны, арганізаваць узаемадзеянне па аптымізацыі мытных і пагранічных працэдур. Усе цягнікі будуць адпавядаць міжнародным стандартам пасажырскіх перавозак.

Для арганізацыі перавозак на чэмпіянат Еўропы ўзгоднена курсіраванне дадатковых сямі пар пасажырскіх цягнікоў у дні правядзення матчаў з удзелам зборнай Расіі: адзін састаў цягніка Масква — Вроцлаў/Варшава, два саставы цягніка Масква — Варшава і чатыры саставы цягніка Масква — Цярэспаль для перасадачных зносін. Акрамя таго, будзе павялічана колькасць вагонаў у цягніках, што будуць курсіраваць па графіку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске информирует о признании недействительными:
- страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 7287138—7287157;
- квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии КС № 0882980—0882982. УНП 100152124

«ВЕЛІКОДНАЕ ДРЭВА» БУДЗЕ РАСЦІ Ў МІНСКУ

Сапраўднае «Велікоднае дрэва» ўчора з'явілася ў Мінску. Яно пад урачысты перазвон было пасаджана каля культурна-дзелавога цэнтра «Дом Масквы» ў Мінску як працяг святкавання светлага Уваскрэсення Хрыстова.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Велікоднае дрэва стала новым сімвалам моладзевага фестывалю-выставы «Велікодны куліч», які ладзіцца ўжо другі год запар. Сёлета яго адкрывалі першы сакратар ЦК ГА БРСМ Ігар Бузоўскі, кіраўнік культурна-дзелавога цэнтра «Дом Масквы» ў Мінску Юрый Багавіцкі і протаіерэй храма Уваскрэсення Хрыстова ў Мінску Рыгор Арбузаў.

Вярбу ўпрыгожылі калекцыяй пісанак, якія вырабіла моладзь. Арганізатары спадзяюцца, што з кожным годам колькасць размаляваных яек на дрэве будзе істотна павялічвацца, і заклікаюць далучацца да ідэі ўсіх ахвотных. Дзякуючы гэтаму дрэва хутка можа стаць мясцовай славутасцю.

Адзін з арганізатараў, першы сакратар ГА БРСМ Ігар Бузоўскі, адзначыў: «Мы распачалі адкрыццё фестывалю — і хмары над галавой разышліся. Велікодныя дні асаблівыя: яны дазваляюць ствараць, у тым ліку ў новай форме. Моладзь не прывабліваюць звычайныя праекты, таму велікоднае дрэва — новы сімвал свята і нашага фестывалю. Мы ўпэўнены, што вакол яго будуць гуртавацца добрыя, цікавыя людзі».

У культурна-дзелавым цэнтры «Дом Масквы» адбылася дэгустацыя велікодных кулічоў, а сцены залаў былі ўпрыгожаны шматлікімі малюнкамі і дэкаратыўнымі кампазіцыямі дзяцей і моладзі на велікодную тэматыку. Асаблівую цікавасць выклікала фотаэкспазіцыя «Святыя месцы паломніцтва».

У межах фестывалю адбыўся дыялог «Моладзь і рэлігія». Па словах протаіерэя Рыгора Арбузава, ён надзвычай актуальны: сёння размова царквы з юнакамі і дзяўчатамі часта аднабаковая, бо маладыя людзі не імкнуцца да шчырай гутаркі.

Фестываль-выстава «Велікодны куліч» будзе доўжыцца сёння і заўтра.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ПАДАЦЬ ІСК МОЖНА ПА ІНТЭРНЭЦЕ

У планах гаспадарчых судоў Беларусі — паступовы пераход да «электроннага правасуддзя»

На мінулым тыдні Вышэйшы Гаспадарчы суд нашай краіны прыняў з візітам старшыню Вышэйшага Арбітражнага суда Расіі Антона Іванова. Падчас сустрэчы калегі абмеркавалі ў тым ліку і пытанні развіцця інстытута «электроннага правасуддзя». У нас яно знаходзіцца толькі ў стадыі развіцця. У Расіі ж ужо сёння каля 15 % іскаў падаецца праз інтэрнэт.

Па звестках Вышэйшага Арбітражнага Суда Расіі, летась сістэмай «Мой арбітр», якая дазваляе падаваць іскавыя заявы ў любы час сутак праз інтэрнэт, скарысталіся 400 тысяч чалавек. Таксама ў «сусветным павуцінні» можна даведацца, калі пададзены іск, на які дзень і час прызначана судовае пасяджэнне, якія рашэнні прыняты па канкрэтнай справе.

— Усе акты, якія прымаюць нашы суды, ужо не першы год публікуюцца ў адкрытым доступе ў сеціве, — пацвердзіў Антон Іваноў. — Дакумент з'яўляецца ў сістэме праз суткі пасля таго, як падпісаны суддзёй. Працэс цалкам аўтаматызаваны, таму ні ў кога няма ўплыву, каб затрымаць публікацыю акта. Мадэрнізацыя накіравана на змяншэнне колькасці папяровых дакументаў, на захаванне якіх страчваюцца немалыя грошы. Наша мэта — з часам, па прыкладзе ЗША, перавесці ўвесь судовы дакументазварот у электронны выгляд.

Старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларусі Віктар КАМЯНКОЎ прызнаўся журналістам, што зацікаўлены ў вывучэнні вопыту расійскіх калег па прыменні «электроннага правасуддзя».

— Нам цікавы вопыт укаранення рэадавых тэхналогій — падачы іскаў і разгляду спраў у электронным выглядзе. А таксама вопыт памылак і рызыкі, якія могуць узнікнуць пры прымяненні гэтай працэдуры. Максімальная адкрытасць электроннага судаводства пры ўсіх яго плюсах прыводзіць да таго, што кожны з бакоў атрымлівае свабодны доступ да інфармацыі, а гэта ў пэўнай ступені раскрывае звесткі аб бізнэс-сакрэтах. У той жа час «электроннае правасуддзе» паскорыць працэс, дазволіць у значнай ступені эканоміць не толькі сродкі, але і час бакоў. Гэта будзе зручна і выгадна для ўсіх, у тым ліку і для дзяржавы.

Бітва за «Сталічную»

Суддзі лічаць вельмі важнай тэму абароны ў Беларусі і Расіі старых савецкіх таварных знакаў і плануюць вынесці гэтае пытанне на абмеркаванне кіраўнікоў дзяржаў.

— Дагэтуль бітва за старыя савецкія брэнды працякае вельмі актыўна, — адзначыў Антон Іваноў. — У прыватнасці, на міжнародным узроўні працягваецца спрэчка за гарэлку «Сталічную», ідуць спрэчкі аб шакаладзе «Алёнка». Відаць, прыйшоў час уводзіць на постсавецкай прасторы сістэму спецыяльнага рэгулявання прадукцыі з такімі брэндамі. Забараніць жа продаж тых ці іншых тавараў — значыць парушыць правы прадпрымальнікаў. І беларускія тавары пад савецкімі брэндамі пастаўляюцца ў Расію, і расійскія — у Беларусь. Калі мы пойдзем па шляху канфлікту і пачнём арыштоўваць цэлыя партыі тавараў, то гэта ні да чаго добрага не прывядзе нашы краіны.

Разам з тым, сказаць, што з заўтрашняга дня гаспадарчыя суды нашай краіны не будуць прымаць іскавыя заявы на паперы, нельга. У планах — паступовы адыход ад папяровага носьбіта. З чым гэта звязана?..

— Справа ў тым, што для ўкаранення «электроннага правасуддзя» ў Беларусі ў першую чаргу неабходна забяспечыць доступ да інтэрнэту ўсіх грамадзян і суб'ектаў гаспадарання, — падкрэсліў Віктар Камянкоў. — Пакуль няма рэальнай магчымасці стварыць роўныя ўмовы для ўсіх суб'ектаў, таму мы сёння захоўваем магчымасць падачы як электроннай заявы, так і заявы на паперы.

Укараняць электронную сістэму падачы заяў кіраўніцтва Вышэйшага Гаспадарчага Суда вырашыла пачаць з Мінска і буйных гарадоў рэспублікі. Для гэтага наладзілі сувязі з райвыканкамамі, праз якія і спрабуюць праводзіць сваю палітыку: прапаноўваюць пастаянным карыстальнікам судовых паслуг накіроўваць заявы ў суд у электроннай форме.

Паводле слоў старшыні Вышэйшага Арбітражнага Суда Расіі, не так проста прымусіць дзяржаўныя органы падаваць іскавыя заявы праз інтэрнэт.

— У прыватнасці, у нас у краіне яны такой магчымасцю не жадаюць карыстацца, — адзначыў Антон Іваноў. — У асноўным падаюць заявы ў электронным выглядзе буйныя кампаніі і адвакацкія бюро. Мы зараз спрабуем змяніць закон і зрабіць прымусовай падачу для дзяржорганаў. Я перакананы, калі абавязаць іх па законе, то працэнт падачы абавязкова павялічыцца. Але да канца ў бліжэйшы час гэта немагчыма зрабіць. Да канца гэта зрабілі толькі краіны з даўняй гісторыяй, у прыватнасці, ЗША. У федэральных судах існуе толькі электронная падача іскаў у суд, ніякай іншай. Але ж там усе справы вядуцца праз адвакатаў, якія маюць доступ да інтэрнэту. У нас, як і ў Беларусі, прадугледжана падача іскавай заявы наўпрост грамадзянам ці юрыдычнай асобай без пасрэдніцтва адваката. І такіх заяў у нас шмат. І гэта ўскладняе ўвядзенне электроннай падачы.

Разгляд спрэчкі на адлегласці ў тысячы кіламетраў — гэта рэальна

Летась у арбітражных судах Расіі ўкаранілі новы элемент «электроннага правасуддзя» — сістэму відэаканферэнцсувязі. За год па відэасувязі было праведзена больш за 25 тысяч судовых пасяджэнняў. Уведзены таксама і анлайн-трансляцыі ўсіх пасяджэнняў Прэзідыума Вышэйшага Арбітражнага Суда Расіі.

— Магчымасці відэаканферэнцсувязі вельмі шырокія, — адзначыў Антон Іваноў. — І менавіта яны, як мне бачыцца, маглі б аблегчыць узаемны разгляд спрэчак паміж прадпрыемствамі Беларусі і Расіі. Асноўай магло б служыць пагадненне паміж нашымі краінамі.

Віктар Камянкоў падтрымлівае гэту ідэю.

— Сапраўды, відэаканферэнцсувязь дазволіць разглядаць справу на адлегласці ў тысячы кіламетраў без выезду за межы краіны, напрыклад, паміж Брэстам і Уладзівастокам. Гэта, зноў такі, эканомія часу і сродкаў. Гэтыя магчымасці, на мой погляд, варта скарыстоўваць не толькі ў межах Саюзнай дзяржавы, але і ў межах Мытнага саюза, СНД.

Надзея ДРЫЛА.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Якія катэгорыі спрэчак дамінуюць паміж беларускімі і расійскімі суб'ектамі гаспадарання?

— Па-першае, гэта спрэчкі, звязаныя з міжнароднымі перавозкамі і стратамі ў іх працэсе: у выніку аварый, гібелі грузу, — праінфармаваў старшыня Вышэйшага Арбітражнага Суда Расіі. — Па-другое, мытныя спрэчкі па абкладанні мытнымі пошлінамі. І нарэшце, падатковыя, звязаныя са спагнаннем НДС.

— У беларускія гаспадарчыя суды расійскія суб'екты гаспадарання падаюць аналагічныя іскі, — дапоўніў старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларусі. — Я б сюды дадаў толькі дагаворныя спрэчкі, звязаныя з невыкананнем розных дамоўленасцяў паміж суб'ектамі гаспадарання Расіі і Беларусі.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

АБЗАЦ

Усе раёны Брэсцкай вобласці прыступілі да пасадкі бульбы. Яе пасадзілі на 1,6 тыс. га, што складае 15,2 % плошчы, адведзенай пад гэтую культуру.

Трагедыяй скончылася застолле раніцай 14 красавіка ў кватэры 46-гадовага магілёўца. Напярэдадні вечарам у госці да яго прыйшла 32-гадовая знаёмая. Гаспадар і госця выпівалі. Каля 4.40 раніцы мужчына па неасцярожнасці штурхнуў сваю госцю, і яна выпала з акна восьмага паверха. Ад атрыманых траўмаў жанчына памерла. Абставіны здарэння высвятляюць супрацоўнікі праваахоўных органаў.

16 красавіка ў 20.00 на вуліцы Якубоўскага аўтамабіль «Фальксваген Гольф» не спыніўся на чырвоны сігнал святлафора, у выніку чаго сутыкнуўся з «Маздай». Інспектарам ДАІ кіроўца «Фальксвагена» сказаў, што ён беспрацоўны. Калі ж работнікі ДАІ сталі высвятляць асобу мужчыны, аказалася, што мужчына працуе інструктарам у адной са сталічных аўташкол. Больш за тое, у момант аварыі ён рухаўся на службовым аўтамабілі. Медыцынскі агляд паказаў у крыві мужчыны 0,32 праміле алкаголю. У ДАІ быў выкліканы кіраўнік гэтай аўташколы.

ПОЎНЫ АБЗАЦ



У Англіі рыжы кот па мянушцы Гарацый, які згубіўся, вярнуўся дадому сам, нягледзячы на зламаныя лапы. Ката не было дома 18 дзён. Гаспадары паўсюдна расклейвалі аб'явы аб яго знікненні, званілі ў ветэрынарныя клінікі. Усе знойдзеныя і дастаўленыя каты аказаліся не Гарацыем. У рэшце рэшт ён сам змог знайсці дарогу і прыйшоў на ганак сваіх гаспадароў. Аказалася, што дадому ён ішоў на зламаных лапах. Жывёлку агледзеў ветэрынар, які адзначыў, што ў такім стане Гарацый пражыў бы яшчэ 5-6 дзён і загінуў. Цяпер ката прааперыравалі, ён узнаўляе сілы.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ДА МОГІЛАК — ДАДАТКОВЫ РУХОМЫ САСТАЎ

У сувязі з масавым наведваннем могілак 21, 22 і 23 красавіка будзе павялічана колькасць аўтобусаў на шэрагу маршрутаў, паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс».

Гэта датычыцца маршрутаў: № 5Э «ДС «Чыжоўка» — Могілкі «Міханавічы», № 68 «ДС «Карастаянавай» — Паўночныя могілкі», № 94С «АС «Аўтазаводская» — Чыжоўскія могілкі», № 109 «ДС «Карбышава» — Паўночныя могілкі», № 172Э «АВ «Маскоўскі» — Каладзішчанскія могілкі», № 402 «АС «Паўднёва-Заходняя» — Заходнія могілкі».

21-24 красавіка будзе арганізавана праца часовых аўтобусных маршрутаў № 135Э «ДС «Захад-3» — Паўночныя могілкі», № 169 «ДС «Чыжоўка» — Чыжоўскія могілкі», №№ 170Э «ДС «Захад-3» — Заходнія могілкі», № 275 «АВ «Маскоўскі» — Каралёў Стан».

24 красавіка будзе павялічана колькасць аўтобусаў на маршрутах: № 5Э «ДС «Чыжоўка» — Могілкі «Міханавічы», № 94С «АС «Аўтазаводская» — Чыжоўскія могілкі», № 172Э «АВ «Маскоўскі» — Каладзішчанскія могілкі», № 402 «АС «Паўднёва-Заходняя» — Заходнія могілкі». Будзе арганізавана праца часовых аўтобусных маршрутаў: № 68С «ДС»Карастаянавай» — Паўночныя могілкі», № 109С «ДС Карбышава» — Паўночныя могілкі», № 171Э «ДС Захад-3» — Могілкі «Міханавічы», № 174Э «Кульман — Паўночныя могілкі», № 167 «1-я брама — 2-я брама», № 22Д «ДС «Чыжоўка» — Ст.м. «Аўтазаводская». Рэжым працы маршрутаў — з 8 да 20 гадзін.

Аплата ў маршрутах №№ 5Э, 68С, 94С, 109С, 135Э, 169С, 170Э, 171Э, 174Э будзе брацца адначасова за паездку ў прамым і зваротным кірунку. Так, кошт праезду ў маршрутах №№ 68С, 94С, 109С, 169С складзе 3 тысячы рублёў, у маршрутах №№ 5Э, 135Э, 170Э, 171Э, 172Э, 174Э — 4,2 тысячы рублёў. У прыгарадных маршрутах №№ 275, 402 аплата за праезд будзе брацца па прыгарадным дадатковым тарыфе.

ДАРОГА — НА РАМОНЦЕ

У рамках праграмы дарожных работ праводзіцца капітальны рамонт участка аўтамабільнай дарогі М-1/Е30 Брэст — Мінск — граніца РФ (607,62 — 609,955 км).

Рух аўтатранспарту ў сувязі з гэтым па 30 чэрвеня будзе весціся па палосах брэсцкага кірунку, з 1 ліпеня па 30 жніўня — па палосах маскоўскага кірунку, паведамілі ў прэс-службе дэпартамента «Белаўтадар» Мінтранса. Спецыялісты звяртаюцца да ўдзельнікаў дарожнага руху з просьбай быць гранічна ўважлівымі і асцярожнымі, захоўваць патрабаванні дарожных знакаў і не выязджаць на палосы, дзе праводзяцца дарожныя работы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СВЕЖАЗРЭЗАНЫЯ КВЕТКІ НА МІЛЬЯРД РУБЛЁЎ

Адразу тры факты незаконнага перавозу кветак праз беларускую мяжу былі выяўлены супрацоўнікамі Ашмянскай мытні. Ва ўсіх выпадках тавар накіроўваўся з Літвы на тэрыторыю краін Мытнага саюза.

А справа была так. Падчас правядзення кантролю ў пункце мытнага афармлення «Каменны Лог» мытнікі выявілі, што ў аўтамабілі перавозіцца на 60 тысяч штук кветак больш, чым пазначана ў суправаджальных дакументах. Акрамя гэтага, у грузавым адсеку выявілі архідэі, якія і зусім не былі заяўлены ў афіцыйных паперах.

Праз некалькі дзён на гэтым жа пасту, як паведамілі ў прэс-службе Мытнага камітэта, былі перапынены яшчэ дзве спробы незаконнай транспарціроўкі кветак праз беларуска-літоўскую мяжу. Агульны кошт нелегальных руж, хрызантэм, архідэй колькасцю больш за 80 000 штук склаў адзін мільярд рублёў.

Леанід ТУГАРЫН.

НА МІКРААЎТОБУС УПАЛА ДРЭВА

Удзень ён быў прыпаркаваны ў вёсцы Паланечка Баранавіцкага раёна каля крамы па вуліцы Цэнтральнай. Мяркуецца, што дрэва павалілася на транспартны сродак ад рэзкага парыву ветру — па звестках метэаслужбы, у гэты час максімальная хуткасць яго складала 13 метраў у секунду.

Як паведамілі ў Цэнтры даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці МНС, у гэты момант кіроўцы ў салоне не было. Як потым высветлілася, 22-гадовы мужчына спыніўся, каб зайсці ў краму. Аднак відавочцы, якія выклікалі выратавальнікаў, паведамілі: ёсць пацярпелыя пасажыры. Імі аказаліся родныя кіроўцы: маці і бацька, пенсіянеры 1937 года нараджэння, і пляменніца, дзяўчынка 2003 года нараджэння. З траўмамі рознай ступені цяжкасці ўсіх іх даставілі ў траўматалагічнае аддзяленне Баранавіцкай гарадской бальніцы №1.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СПРОБА ПАСПЫТАЦЬ НАРКОТЫКІ КАШТАВАЛА СТУДЭНТУ ВІЦЕБСКАЙ ВНУ BR100 МЛН

Пра гэта паведаміў БЕЛТА старшы памочнік пракурора Чыгуначнага раёна Віцебска Антон Зыкаў.

У снежні мінулага года ўраджэнец Расійскай Федэрацыі, які вучыўся на пятым курсе адной з ВНУ Віцебска, набыў у цэнтры горада за Br1 млн 2 г марыхуаны і амфетаміну. Супрацоўнікам праваахоўных органаў студэнт сказаў, што набыў наркатычныя рэчывы для сябе — захацеў паспытаць.

Знайсці сведчанні дачынення студэнта да распаўсюджвання наркотыкаў супрацоўнікам праваахоўных органаў не ўдалося. З улікам станоўчай характарыстыкі, высокай паспяховасці ва ўніверсітэце і адсутнасці праблем з законам раней пакараннем за спробу паспытаць забароненыя рэчывы стаў для студэнта буйны штраф (Br100 млн) і сапсаваная біяграфія.

■ Пытальнік

РУХ АЎТОБУСАЎ БЫЎ ПРЫПЫНЕНЫ. АДНАК, КАБ ЗАДАВОЛІЦЬ ПАТРЭБЫ Ў ПЕРАВОЗКАХ, ЁН... АДНАЎЛЯЕЦЦА

Звяртаюцца да вас жыхары аграгарадка ды і, напэўна, усяго раёна, якіх пазбавілі магчымасці праезду ад Любані да Жыткавічаў, паколькі аўтобус Мінск — Жыткавічы, што па раскладзе быў кожны дзень, цяпер ходзіць толькі па пятніцах, суботах і нядзелях. І вось як людзям дабірацца ў абодвух кірунках па будных днях? Гэта матывуюць тым, што, маўляў, маршрут нерэнтабельны. Калі стратны «МАЗ», пусціце «ПАЗ». Калі і ён будзе стратным, дык маршрутку, якая раней хадзіла і не была стратнай!.. Калі з Мінска не будзе аўтобуса, дык няхай адкрыюць маршрут Салігорск — Жыткавічы ці Любань — Жыткавічы. Толькі ад Любані на гэтай міжгародняй трасе размешчана больш за 10 буйных вёсак, насельніцтва якіх карыстаецца аўтобусам гэтага маршрута. А далей ідуць вёскі Жыткавіцкага раёна.

Мікалай Аляксеевіч БРАГІНЕЦ,
аграгарадок Сосны-1 Любанскага раёна.

Мы некалькі скарацілі ліст чытача (Мікалай Аляксеевіч нават схему з аўтобусным маршрутам даслаў: праз якія канкрэтна вёскі той пралягае), як і адказ з Міністэрства транспарту і камунікацый, куды звярталіся па каментарый. Калі гаварыць па сутнасці праблемы, карысны будзе такая інфармацыя. Напачатку — для агульнага разумення сітуацыі.

«Мінтрансам прадастаўлена права на выкананне міжгародніх міжабласных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах па маршруце Мінск — Жыткавічы праз Любань дзяржаўнаму прадпрыемству «Мінсктранс» (далей ідзе пералік-табліца маршрутаў, аўтобусамі якіх можна зараз скарыстацца для паездкі з Мінска ў Жыткавічы. — **Рэд.**)

На працягу некалькіх апошніх гадоў з-за нізкага пасажырапатоку (асабліва ў асенне-зімовы перыяд) з мэтай зніжэння стратнасці работы на гэтым маршруце аўтамабільным перавозчыкам прымаліся меры па аптымізацыі перавозак пасажыраў: змянялася перыядычнасць выканання рэйсаў, рухомы састаў (выкарыстоўваліся аўтобусы малой умяшчальнасці).

Пры гэтым трэба адзначыць, што аналіз па маршруце Мінск — Ждановічы праз Любань, які праводзіўся супрацоўнікамі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» і ААТ «Гомельаблаўтатранс», паказаў: згодна з інфармацыяй аб прададзеных білетах, пасажырамі набываліся з Жыткавічаў да Любані адзін-два білеты, астатнія пасажыры ехалі да бліжэйшых населеных пунктаў Жыткавіцкага раёна, транспартнае абслугоўванне якіх у кірунку Любані па ўсіх днях тыдня выконваецца прыгараднымі аўтобусамі па маршруце Жыткавічы — Дзякавічы. Улічваючы выкладзенае, у сувязі з нізкім пасажырапатокам і стратнасцю перавозак, з 17 лютага 2012 года быў прыпынены рух аўтобусаў дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» па маршруце Мінск — Жыткавічы праз Любань па будных днях (акрамя пятніцы)».

А далей у адказе з міністэрства ўтрымліваецца інфармацыя, якая, спадзяёмся, парадуе нашага заяўніка і яго аднавяскоўцаў.

«Разам з тым, паведамляем, што ў мэтах задавальнення патрэбы насельніцтва ў перавозках у вышэйназваным кірунку, з 9 красавіка 2012 года плануецца аднавіць рух аўтобусаў дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», якія выконваюць міжгароднія міжабласныя аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах па маршруце Мінск — Жыткавічы праз Любань (рэйсы адпраўленнем з Мінска ад аўтавакзала «Усходні» ў 7.40, ад аўтастанцыі «Жыткавічы» — у 16.05) па панядзелках, аўторках, серадах і чацвяргах»

■

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

18 красавіка 2012 г. № 8 (280)

УЛАСНАЕ ЦІ ДЗЯРЖАЎНАЕ?

ПРЫЦЯГНЕННЕ ЗЯМЛІ

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

У вёску Даўгінава, што на Вілейшчыне, мяне падкінуў на асабістай легкавушцы сваяк, які ехаў у суседні Мядзел па неадкладных справах. Таму ў вёсцы я была, як толькі развіднела. Між іншым, каля «эстакады» — пляцоўкі з доўгім дашчаным сталом, дзе прымаюць малако, — ужо сабраліся сяляне.

«Не хочаш карову, абзавядзіся казой»

З-за павароту пачуўся гул машыны. Народ павесялеў, заварушыўся: маўляў, як заўжды, своечасова — гадзіннік можна звяраць. Пакуль сяляне выліваліся малако ў цыстэрну, я разгаварылася з мясцовай жыхаркай Раісай Ніжнік, якая гасцінна запрасіла мяне дадому.

Раіса Паўлаўна жыве з мужам Віктарам Браніслававічам, дзеці вывучыліся, разляцеліся з роднага гнязда. Дачка — у Мінск, а сын — наогул за акіян, у Амерыку. Па спецыяльнасці ён, як і бацька, ветэрынар, лечыць хатніх жывёл у прыватнай клініцы.

Прыватная гаспадарка — асаблівы гонар Раісы Паўлаўны. У хлеўчуку вішчаць чатыры парсючкі (а было наогул шэсць), перабіраюць сена дзве кароўкі і цялё.

Ва ўладанні Ніжнікаў 25 сотак зямлі, з якіх значная частка занятая пад агарод. Яшчэ 20 гектараў зямлі ў полі, паколькі гаспадар аформіў на сябе фермерства. Вырошчваюць на ўчастку трыцікале, авёс, жыта, кармавыя сумесі. Але ў гэтым годзе вырашылі адмовіцца ад зямлі з-за хваробы мужа.

Раіса Паўлаўна лічыць, што сорам жыць у вёсцы і не трымаць гаспадарку: «Толькі гультай на такое здатны. Не хочаш карову, абзавядзіся казой». У Ніжнікаў на стале ўсё сваё: і яйкі, і малако, і смятана, і тварог, і свежаніна. Ёсць неабходная электратэхніка для перапрацоўкі малака: маслабойка, сепаратар. Штодзень жанчына надойвае 35 літраў ад адной з кароў, з іх 21 літр здае дзяржаве, астатнія расходуе на тое, каб напаіць цяля і нават курэй — лепш нясуцца. Акрамя таго, і самім хапае, і свацці застаецца.

— Ці выгадна ў наш час трымаць рагулю?— цікаўлюся ў жанчыны.

— Бяспрэчна, — Раіса Паўлаўна дастае блакнот. — У мяне ўсё пад строгім улікам і кантролем. За студзень у фізічнай вазе здала 651 літр малака, у заліковай — 744, атрымала 1 млн 694 тыс. рублёў — важкая прыбаўка да сямейнага бюджэту. У лютым прыбытак атрымаўся большы. А вясной і летам, калі жывёла выходзіць на пашу, то даходы яшчэ ўзрастуць. Праўда, іх велічыня ў многім залежыць ад тлустасці прадукцыі.

Года паўтара таму, успамінаюць даўгінаўцы, тутэйшая малаказборшчыца заніжала тлустасць — ва ўсіх яна была надта нізкая, як пад капірку: 2,2 — 2,5%. Вяскоўцы ў рэшце рэшт дабіліся, каб прадукцыю прымаў ад іх прыватны прадпрымальнік з Докшыцаў Алег Асаёнак, які абслугоўваў на той час іншыя вёскі сельскага Савета і пра якога чулі ад суседзяў толькі добрае.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ГЕНЕРАЛЬНАЯ ЎБОРКА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ШТО ЗА ФАСАДАМ?

Наталля КАРПЕНКА

Вы раскідваеце смецце па сваёй кватэры? Пакідаеце на дыванах і падлозе аборткі, пустыя бутэлькі, цыгарэтныя недакуркі і г.д.? Напэўна, не, калі вы — нармальны чалавек. Але чаму, выходзячы за парог дома (офіса, прадпрыемства), адэкватныя, здавалася б, грамадзяне ператвараюцца ў «вытворцаў і распаўсюджвальнікаў» таго самага смецця, з якім змагаюцца ў межах уласнай кватэры? Або — у лепшым выпадку — у пасіўных назіральнікаў: маўляў, ляжыць — ну і хай сабе ляжыць: прыйдуць камунальнікі і прыбяруць... І разам з тым (парадокс?) большасць з нас хоча жыць у прыгожых горадзе ці вёсцы, на чыстай вуліцы, у доме з добраўпарадкаванай прылеглай тэрыторыяй... Хто ж павінен ствараць утульнасць і прыгажосць, наводзіць «лоск», падтрымліваць чысціню? Як заахвоціць і адказных асоб, і звычайных грамадзян сачыць за «парадкам у доме» — не толькі ўнутраным, але і вонкавым? Адказаць на гэтыя пытанні мы папрасілі старшыню Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлану ГЕРАСІМОВІЧ.

— Тэма добраўпарадкавання не страчвае актуальнасці. Як і пяць гадоў таму, і дзесяць... Як думаеце, Святлана Міхайлаўна, ці можна ўвогуле прывучыць да парадку?

— Можна выпрацаваць сістэму, пры якой гэты парадак не захочацца парушаць. Немагчыма «навесці прыгажосць» аднойчы і назаўсёды — ахвотнікі сапсаваць «карцінку» ўсё роўна знойдуцца. Ды і справа не ў іх адных. За зіму, і ўвогуле з цягам часу, шмат што прыходзіць у непрыдатнасць: агароджы, гаспадарчыя пабудовы, жылыя дамы... Іх трэба зносіць, прыбіраць, аднаўляць. Гэта бясконцы працэс, да якога неабходна ўвесь час вяртацца. Мы ж у сваёй хаце, кватэры прыбіраем рэгулярна, і ніхто нас не прымушае, не нагадвае пра адказнасць, не палохае адміністрацыйнымі захадамі... А вось з тэрыторыяй па-за межамі нашага жылля ўжо ўзнікаюць пытанні. Участковага міліцыянера ці работніка санстанцыі да кожнага не прыставіш, але мы ў вобласці стварылі сваю сістэму па навядзенні парадку. І яна дзейнічае, я лічу, і дае вынікі, што заўважаюць і жыхары вобласці, і нашы госці.

— Вы маеце на ўвазе «Адзіныя патрабаванні да добраўпарадкавання індывідуальных жылых забудоў», распрацаваныя летась?

— Не толькі. Напрыклад, зімой мы не сядзелі склаўшы рукі. Ледзь не кожны тыдзень выязджалі разам з губернатарам у адзін з раёнаў і глядзелі, як ідзе рэканструкцыя фермаў, што робіцца ў вёсках, у сельсаветах. Дарожныя службы высякалі кустоўе і сухія дрэвы ўздоўж праезных частак. Сельвыканкамы займаліся пошукам спадчыннікаў пустуючых дамоў, зносілі старыя будынкі, працавалі са спадчыннікамі зямельных участкаў — незавараных і закінутых, прапаноўвалі перадаваць надзелы ў агульныя палі севазвароту або ўвогуле адмаўляцца ад іх... Многія раёны зімой выраблялі агароджы (так бы мовіць, у запас), заключыўшы дагаворы з ЖКГ і прыватнымі структурамі... Цяпер насельніцтва, з якім праведзена тлумачальная работа, ставіць новыя агароджы не за дзяржаўны кошт і нават не за 50 працэнтаў ад рэальнага кошту, а цалкам аплачвае ўстаноўку — тым больш што гэта можна зрабіць у растэрміноўку на паўгода.

Ну а што датычыцца «Адзіных патрабаванняў да добраўпарадкавання індывідуальных жылых пабудоў» — пра іх, напэўна, ведаюць ужо ўсе, і не толькі ў Мінскай вобласці. Нават з іншых рэгіёнаў нам тэлефанавалі — прасілі даслаць экзэмпляр. Сёлета, на пачатку вясны, я правяла абласную селектарную нараду і яшчэ раз нагадала ўсім службам — землеўпарадкавальнай, санітарнай, прыродаахоўнай і іншым — пра гэтыя патрабаванні, пра неабходнасць узмацніць кантроль за ўтрыманнем дваровых тэрыторый і месцаў агульнага карыстання. Правілы ёсць, і яны павінны выконвацца.

— За невыкананне караеце рублём?

— Да «Адзіных патрабаванняў...» мы далучылі артыкулы з Адміністрацыйнага Кодэкса — усяго 21 — якія можна прымяніць у дачыненні да нядбайных гаспадароў, а гэта прадугледжвае штраф у памеры ад 5 да 50 базавых велічынь. У сувязі з тым, што базавая велічыня выраслa, сумы могуць атрымацца немаленькія. Давайце ўжо, нарэшце, адыдзем ад утрыманскіх настрояў, перастанем патрабаваць ад улады, каб яна прыбірала тэрыторыю вакол нашых домаўладанняў. У сталых, нямоглых ёсць дзеці, сваякі, тыя, хто будзе потым прэтэндаваць на іх спадчыну — няхай дапамагаюць.

— Але мясцовым уладам часта даводзіцца шукаць меры ўздзеяння ў дачыненні да грамадзян, якіх не назавеш нямоглымі — хутчэй наадварот... Распачаўшы на сваім участку будаўніцтва ці рэканструкцыю, яны ператвараюць у сметнік не толькі ўласны двор, але і прылеглыя тэрыторыі. На папярэджанні не рэагуюць, яшчэ і самі могуць папярэдзіць: у мяне, маўляў, сувязі «дзе трэба»...

— Ёсць і такія, у тым ліку і сярод работнікаў дзяржструктур. Яны маюць нерухомасць у сельскай мясцовасці, таму сельскім уладам даводзіцца з імі працаваць, прымяняць, калі трэба, адміністрацыйныя захады, штрафаваць. У такім выпадку прадстаўнік сельвыканкама абавязкова запрашае з сабой участковага міліцыянера, які на месцы складае пратакол.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

А МЫ — СУПРАЦЬ!

Дзясяткі жыхароў Віцебска катэгарычна супраць будаўніцтва моста цераз Заходнюю Дзвіну. З аднаго боку, новы мост, безумоўна, дазволіць разгрузіць транспартны рух у цэнтры горада. І транзітны транспарт, у тым ліку і фуры, змогуць хутчэй праязджаць цераз Віцебск. На думку незадаволеных, мост, які запланавана пабудаваць недалёка ад гістарычнага цэнтра старажытнага Віцебска — паблізу ад пешаходнай яго часткі, якраз у бок плошчы Леніна — можа негатыўна паўплываць на стан навакольнага асяроддзя. Ды і ўтульны сквер, і ціхія вулачкі ператворацца ў гучную магістраль. Логіку гараджан, якія жывуць у прэстыжным і ціхім месцы, зразумець можна. Каму ж захочацца змяніць чыстае паветра і спакой на шум і выхлапныя газы?

Жыхары дамоў на вуліцы Чэхава пішуць лісты ў розныя інстанцыі, звяртаюцца па дапамогу ў СМІ:

— Вельмі важна, зразумела, разгрузіць цэнтр горада ад транзітнага транспарту. Але чаму так званы паўночны мост вырашылі пабудаваць з аднаго боку ракі ў раёне сквера Партызанскай славы, ля будынка, узведзенага яшчэ да рэвалюцыі 1917 года, дзе знаходзіцца музей імя Міная Шмырова (легендарнага партызанскага камандзіра. — **Аўт.**), а таксама каля помніка Уладзіміру Караткевічу, недалёка ад абласной Дошкі гонару...

Тыя, хто выступае супраць будаўніцтва, не могуць зразумець: чаму ў ціхім куточку горада, дзе традыцыйна любяць прагульвацца бацькі з малымі дзецьмі і пенсіянеры, дзе нямала турыстаў, вырашылі пачаць будаўніцтва моста? Маўляў, для гэтага прыйдзецца знішчыць частку сквера, які ў апошнія некалькі гадоў актыўна добраўпарадкоўвалі. Навошта тады траціліся грошы? Задзейнічалі людзей, тэхніку? А што рабіць з пералічанымі вышэй помнікам, дошкай, будынкам?

Галоўны архітэктар горада Віцебска Віталь ДУБІК у ліку іншых агучыў план будаўніцтва паўночнага моста падчас сустрэчы з гараджанамі ў выставачнай зале «Цэнтра культуры «Віцебск». Паводле ягоных слоў, узвядзенне моста прадугледжана генеральным планам горада.

А што лічаць эколагі? І чаму не правялі грамадскае абмеркаванне планаў будаўніцтва моста?

— У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе» мост не з'яўляецца аб'ектам дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, — кажа Руслан ВІНАКУРАЎ, старшыня Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. — Ацэнка ўздзеяння на навакольнае асяроддзе і грамадскія слуханні — у адпаведнасці з гэтым Законам — па такім аб'екце не праводзяцца. Улічваючы, што планы па будаўніцтве моста дэталёва не прапрацоўваліся і на момант нашай гутаркі не было прынята рашэнне аб выбары ўчастка пад будаўніцтва моста, адказаць на пытанне аб неабходнасці правядзення грамадскага слухання не ўяўляецца магчымым.

Калі гэты артыкул рыхтаваўся да публікацыі, стала вядома, што, улічваючы рэзананс сярод зацікаўленых гараджан па пытанні будаўніцтва моста і просьбы некаторых прыслухацца да аргументаў супраць будаўніцтва, пытанне будзе разгледжана ў межах абмеркавання горадабудаўнічай палітыкі Віцебска.

У абласным цэнтры, акрамя паўночнага, плануецца пабудаваць яшчэ адзін мост цераз Заходнюю Дзвіну. У любым выпадку гораду патрэбны новыя «пераезды» цераз раку. І, зразумела, адказным асобам трэба выбраць удалае месца, каб размяшчэнне аб'екта было аптымальным.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Госці» прыходзяць штодня

Штодзённы маніторынг праблемных сем'яў уведзены ў Магілёўскай вобласці

— Мы павінны кожны дзень рабіць маніторынг у гэтых сем'ях з прыцягненнем усіх суб'ектаў прафілактыкі, дэпутацкага корпуса і грамадскасці, каб звесці колькасць пажараў, надзвычайных сітуацый і гібелі ў іх людзей да мінімуму, а лепей да нуля, — такое даручэнне зрабіў на нарадзе старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік.

У рэгіёне выяўлена 1641 домаўладанне з ліку праблемных. У іх жывуць адзінокія састарэлыя людзі, нямоглыя інваліды, шматдзетныя сем'і альбо такія сем'і, дзе людзі п'юць і вядуць асацыяльны лад жыцця. Улады вырашылі ўзяць такія дамы і кватэры на асаблівы кантроль, каб ліквідаваць пагрозу для жыцця іх жыхароў.

На жаль, схема «выпіў-закурыў-заснуў» не страчвае сваю небяспечную актуальнасць у сумнай пажарнай статыстыцы. Для папярэджання небяспечных сітуацый МНС праводзіць вялікую прафілактычную працу — у прыватнасці, з пажарнымі апавяшчальнікамі. Але цяпер выратавальнікі аб'яднаюць свае высілкі з іншымі службамі.

— Для штодзённага маніторынгу за праблемнымі сем'ямі замацаваны прадстаўнікі суб'ектаў прафілактыкі: сацыяльнай абароны, адукацыі, сельскіх выканкамаў, міліцыі і МНС, — растлумачыла галоўны спецыяліст цэнтра прапаганды і навучання пры Магілёўскім абласным УМНС Інэса Ялфімава. — Для агляду штодня будзе прыходзіць адзін з замацаваных за сям'ёй прадстаўнікоў. Яны будуць ацэньваюць знешнюю сітуацыю: як працуе печка, ці спраўная электраправодка, ці цвярозыя бацькі, ці не галодныя дзеці і гэтак далей, і прымаць захады да ліквідавання праблем. Гэты штодзённы маніторынг будзе рабіцца да таго часу, пакуль абстаноўка ў сям'і не нармалізуецца.

Ілона ІВАНОВА.

ШТРЫХІ ДА «ПАРТРЭТА»

КАМУ ПАТРЭБНЫ ПАРАДАК?

Як толькі сышоў снег, у Заслаўі пачалі займацца навядзеннем парадку. Тут ужо давялі да ладу скверы і паркі, мемарыяльныя помнікі, могілкі. Зараз, калі часцей выглядвае сонца, фарбуюць прыпынкі, займаюцца кветнікамі, клумбамі, альпійскімі горкамі. Дарэчы, у гэтым сезоне горад будуць упрыгожваць дзесяць тысяч кветак.

Праязджаем па вуліцах разам з начальнікам участка добраўпарадкавання КУП ЖКГ Мінскага раёна Аляксандрам Шутом. На агульную гарадскую «карцінку» засталося толькі нанесці «штрыхі», бо ўжо цяпер, пасля зімы, ён выглядае ўтульным і чыстым. Дзе-нідзе мясцовыя жыхары падмятаюць, мыюць вокны...

— На жаль, часцей навядзенне парадку патрэбна камунальным службам, а не насельніцтву, — каментуе Аляксандр Уладзіміравіч. — Людзі сталага ўзросту, вясковыя жыхары заўсёды даглядаюць сваю тэрыторыю, больш актыўна адгукаюцца і на правядзенне суботнікаў. А новае пакаленне імкнецца жыць «па-новаму»: калі ў сваім двары прыбяруць ды на дарогу смецце не выкінуць — і тое добра.

21 красавіка ў Беларусі пройдзе агульнарэспубліканскі суботнік. Заробленыя на ім сродкі накіруюць на ўзвядзенне новага будынка Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых лагераў да летняга сезона.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

г. Заслаўе.



Славутасцю Заслаўя з'яўляецца Праабражэнская царква, пабудаваная ў сярэдзіне XVI-XVII ст.

Дарогі дачакаліся...

У горадзе прывялі ў парадак усе мемарыяльныя помнікі, таму да 9 мая застанецца толькі пасадзіць кветкі.

Галоўны кветнік горада, што на цэнтральнай плошчы — самае любімае месца адпачынку жыхароў.

НЕ Ў ФОРМЕ СПРАВА

Агульнарэспубліканская акцыя «Сябруем з законам» днямі завітала ў Фрунзенскі раён сталіцы. У сярэдняй школе № 116, дзе існуюць прававыя класы, па ініцыятыве савета грамадскага пункта аховы парадку №4 адбылася прафарыентацыйная сустрэча навучэнцаў 10-11 класаў Фрунзенскага раёна з прадстаўнікамі УУС.

Дырэктар школы Ларыса Слука і старшыня савета грамадскага пункта, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валянціна Жураўская ўпэўнены, што робяць для дзяцей вельмі карысную справу. Навучэнцы прафарыентацыйных прававых класаў маюць цесныя стасункі з Акадэміяй МУС. У якасці факультатываў і грамадскай дзейнасці (у той жа час займаючыся па агульнаадукацыйнай праграме сярэдняй школы) яны спасцігаюць азы міліцэйскай працы. «Пры паступленні ў Акадэмію яны маюць перавагу пры роўнай колькасці балаў, — расказвае Ларыса Слука. — Ды і ўвогуле іх усіх там ужо ведаюць па прозвішчах, калі яны заканчваюць школу». Але не гэта галоўная мэта такіх класаў. Па словах дырэктара, для тых, хто нават не паступіць пасля і не стане міліцыянерам, усё роўна гады навучання ў гэтых класах дадуць пэўны плён: «Гэта ўжо будуць тыя грамадзяне, якія самі не парушаць закон, свайму сябру не дадуць гэтага зрабіць. Таму ў любым выпадку мы працуем на будучыню нашай дзяржавы. У нас жа некалі былі фізіка-матэматычныя класы. Але ж гэта не азначала, што ўсе будуць фізікамі і матэматыкамі. Усе разышліся па розных ВНУ і атрымалі розныя прафесіі. Аднак іх навучылі быць добрымі людзьмі. Галоўнае тут не прафарыентацыя, а выхаванне сумленных грамадзян». Ды і прымусова туды нікога не прыводзяць. Проста дзеці яшчэ з пачатковых класаў бачаць старэйшых вучняў, якія ходзяць у форме, і пытаюцца: «А калі і нам можна будзе таксама пайсці туды вучыцца?» Тут атрымліваецца, што роўны навучае роўнага: школьнікі больш ахвотна прыслухоўваюцца да сваіх аднагодкаў, чым да нудных павучанняў дарослых.

Гэтыя дзеці зараз мараць аб тым, што будуць служыць сваёй Айчыне пасля заканчэння школы. Іх не пужае нават тое, з чым ім прыйшлося сутыкнуцца ў Акадэміі. На адзін дзень іх забралі туды пажыць так, як жывуць курсанты — вытрымалі і не перадумалі. Напрыклад, Павел Малчанаў хоча паступаць на следча-экспертны факультэт. Яго сябар Уладзіслаў Галуза марыць пра аператыўную працу. Дарэчы, і дзяўчаты таксама хочуць служыць у міліцыі. Аліна Кудрашова думае ісці ў крыміналісты. Яна кажа, што дзяўчаты вельмі хочуць у Акадэмію: «Напэўна, яшчэ больш, чым хлопцы». Аліна сцвярджае, што навучанне ў прававым класе выхоўвае: «Калі мы носім форму, унутрана адчуваем пэўныя межы, за якія пераходзіць нельга. Мы з'яўляемся прыкладам для іншых».

Добра, калі такія хлопцы і дзяўчаты пасля пойдуць у міліцыю. Тым больш што, па словах Веры Майсейшынай, начальніка аддзела ідэалагічнай працы Адміністрацыі Фрунзенскага раёна, Міністэрства ўнутраных спраў пакутуе з-за кадравага голаду. І гэта таксама адна з прычын правядзення падобных мерапрыемстваў. Тое самае пацвярджае і намеснік начальніка Акадэміі МУС па ідэалагічнай працы і кадравым забеспячэнні, падпалкоўнік міліцыі Сяргей Мацко. Ён упэўнены, што сёння рыхтаваць абітурыентаў для сябе павінна не толькі Акадэмія, але і любая вышэйшая навучальная ўстанова. «А яшчэ мы ствараем станоўчы імідж міліцыі нашай краіны» — кажа ён. А Валянціна Жураўская падмацоўвае гэтую думку сваім асабістым прыкладам: «У мяне муж — палкоўнік міліцыі, і я заўсёды ведаю, што ў доме ёсць мужчына, які абароніць мяне ад усіх і ад усяго, бо гэта сумленны, справядлівы і моцны чалавек».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ШТО ЗА ФАСАДАМ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— У першым квартале гэтага года кіраўнікам прадпрыемстваў Мінскай вобласці было выпісана больш за 580 штрафаў за антысанітарыю...

— Ёсць такое паняцце, як «састарэлая псіхалогія». У сапраўднага гаспадара парадак заўсёды і ва ўсім, яму не трэба тлумачыць, чаму вакол фермы не павінна быць гразі па калена. А калі гаспадара, фігуральна кажучы, няма, калі месяцамі нікога не хвалююць ні тэрыторыя, ні адходы, то прывесці ўсё ў парадак за адзін момант немагчыма... Мы пайшлі па іншым шляху: пачалі штрафаваць не прадпрыемства (бо для яго гэта сапраўды як укус камара), а непасрэдна адказных асоб. І гэта дзейнічае... Ну і пасля рабочых выездаў у раёны запрашаем на выніковую нараду кіраўнікоў мясцовых гаспадарак, арганізацый, сельсаветаў і робім аналіз... Скажу шчыра: пасля гэтага аналізу сёй-той кіраўнік можа і без працы застацца. Таму што там, дзе беспарадак, звычайна і вытворчасць не на лепшым узроўні.

Займаемся і жыллём, якое раней знаходзілася на балансе калгасаў. Цяпер прынята рашэнне аб яго канчатковай перадачы на баланс ЖКГ — каб не паўтарылася сітуацыя, што ўзнікла ў Чэрвеньскім раёне. Там гаспадарка памяняла ўласніка, і жыллёвы фонд застаўся быццам бы нічыйным... Сёння такое жыллё спачатку прыводзіцца сельгаспрадпрыемствамі ў нармальны стан, а потым перадаецца — паэтапна — камунальным службам. Да 1 чэрвеня перадача павінна быць завершана. І гэта таксама датычыцца добраўпарадкавання. У будынкаў з'явіцца гаспадар — значыць, там будзе падтрымлівацца парадак. А захочуць людзі прыватызаваць гэта жыллё — на мой погляд, няхай прыватызуюць. Будуць больш яго берагчы.

— Мінская вобласць пайшла па шляху ліквідацыі міні-палігонаў для цвёрдых бытавых адходаў — у кожным раёне павінны застацца толькі 3—4 буйныя «пляцоўкі» для гэтых мэтаў. Некаторыя вашы калегі сумняваюцца ў мэтазгоднасці такога рашэння: маўляў, чым менш «арганізаваных» палігонаў, тым больш несанкцыянаваных звалак...

— Ніякіх несанкцыянаваных звалак не будзе, калі правільна арганізаваць сістэму вывазу смецця... У нас таксама былі незадаволеныя ліквідацыяй міні-палігонаў. Але губернатар падышоў да гэтага пытання жорстка: павінна быць толькі так, а не інакш. Насельніцтву тлумачылі: неабходна заключаць дагаворы з ЖКГ на вывяз смецця. Ды і не толькі з ЖКГ, а і з гаспадаркамі, з прыватнымі прадпрымальнікамі, калі ёсць такая неабходнасць.

Не скажу, што было проста. Даводзілася ледзь ці не кожны тыдзень кантраляваць, колькі і дзе ліквідавана звалак, ці не ўзнікаюць яны зноў, падключаць участковых. У рэшце рэшт, людзі прызвычаіліся да цэнтралізаванага вывазу. Сёлета амаль 99 працэнтаў насельніцтва ў сельскай мясцовасці заключылі дагаворы з ЖКГ. Зразумела, пэўныя складанасці ўзнікаюць, ёсць пытанні да працы раённых прадпрыемстваў ЖКГ — але толькі не ў тых раёнах, дзе з гэтых службаў строга спаганяюць, як, напрыклад, у Бярэзінскім раёне.

— Дачнікі таксама заключаюць дагаворы на цывілізаваны вываз адходаў?

— З садовымі таварыствамі заўсёды было складана працаваць. Але і тут справы скрануліся з месца: давялося неаднойчы збіраць старшынь гэтых таварыстваў, тлумачыць, пераконваць... Дапамагаем ім устанаўліваць кантэйнеры, абуладкоўваем спецыяльныя пляцоўкі. Там яшчэ далёка не ўсё зроблена, але робіцца. Дачныя таварыствы, як ніхто іншы, жывуць стэрэатыпамі былых часоў. Замест таго, каб вырашыць тое ці іншае пытанне ў складчыну, як гэта робяць нават у вёсках, яны патрабуюць ад улады не проста даць ім неабходнае, а яшчэ і даць задарма: электрычнасць, дарогі, ваду. Так што працаваць яшчэ ёсць над чым.

— Галоўная адказнасць за добраўпарадкаванне ўскладзена на райвыканкамы. Але спагоняць і з сельскіх Саветаў таксама... Ці ёсць у пярвічнага звяна ўлады магчымасці для навядзення парадку на тэрыторыі?

— У сельскіх Саветаў перш за ўсё ёсць магчымасць працаваць з людзьмі — проста гэту працу трэба па-іншаму арганізоўваць... Напрыклад, яшчэ пазалетась старшыні нашых сельскіх Саветаў пачалі праводзіць свае планёркі — з запрашэннем прадстаўнікоў усіх раённых службаў, якія працуюць на тэрыторыі. З іх дапамогай яны вырашаюць свае пытанні.

Акрамя гэтага, за сельсаветамі замацаваны шэраг гарадскіх арганізацый — каб дапамагаць не тым вяскоўцам, хто можа навесці парадак, а тым, хто не можа... Мы ж не толькі спаганяем з сельскай улады, але і імкнёмся яе падтрымаць.

Але галоўнае, каб самі людзі ўдзельнічалі ў добраўпарадкаванні — вуліц, тэрыторый, могілак... Бо навядзенне парадку насамрэч далёка не заўсёды патрабуе вялікіх фінансавых затрат: часам дастаткова падняць тое, што ўпала на зямлю, выраўнаваць тое, што скасабочылася, насыпаць клумбу, пасадзіць кветкі... Усё гэта можна рабіць без напамінаў і папярэджанняў, з дня ў дзень, культывуючы ў сабе і іншых пачуццё прыгожага.

ПРЫЦЯГНЕННЕ ЗЯМЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Сапраўды, жыхары Даўгінава вельмі задаволены Алегам Яўгенавічам: той працуе сумленна, без падману. А пробу на тлустасць малака ў прыватным парадку можна здаць на Вілейскім малаказаводзе, куды прадпрымальнік прызначыў сваю лабарантку. У вяскоўцаў нават думкі не з'яўляецца, каб разбавіць малако вадой і ў выніку страціць немалыя грошы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вяскоўцы просяць сенакос

У начальніка мясцовага аддзялення сувязі Людмілы Урублеўскай у гаспадарцы адна карова, а ў яе намесніцы Тамары Казулі — аж тры.

— Прачынаюся а палове пятай раніцы, каб падаіць. Клопатаў, вядома, шмат, але ж на асноўны заробак не пражывеш. Тым больш што дачка вучыцца ва ўніверсітэце — таксама дапамога патрэбна.

Па словах жанчын, грэх скардзіцца, за малако яны маюць нядрэнныя грошы. Акрамя таго, за здадзенае цялё ТАА «Даўгінаўскі» забяспечвае кармамі. Але тым, хто не працуе непасрэдна ў акцыянерным таварыстве — пенсіянерам, служачым, медыкам, настаўнікам, пракарміць жывёлу ўсё роўна цяжкавата. На думку маіх субяседніц, калі б гэтай катэгорыі грамадзян гаспадарка выдзяляла сенакос за ўмераную плату, то ў іх быў бы большы стымул абзавесціся падсобнай гаспадаркай, бо, як кажуць, малако ў каровы на языку.

Барысаўскі камбінат хлебапрадуктаў у Даўгінаве адкрыў краму, дзе можна набыць камбікорм. У ёй багаты выбар — для курэй, свіней, буйной рагатай жывёлы. Цэны — ад 60 да 70 тысяч рублёў за 30 кілаграмаў. Сярод пакупнікоў вылучаюцца муж з жонкай. Адразу відаць — прыезджыя. Сапраўды, яны наведаліся ў гандлёвы пункт з Мядзельскага раёна, каб набыць мех-другі «далікатэсаў» для хатняй жывёлы. Пакупнікі прыйшлі да высновы, што суседзям пашанцавала. Для жыхароў іх неперспектыўнай вёскі такая крама — неажыццявімая мара.

— Пытанне наконт сенакосу вяскоўцы аднойчы ўжо ўзнімалі, і гаспадарка пайшла ім насустрач. Але частка адмовілася ад паслугі, паколькі людзі хацелі, каб яна была бясплатнай. Але гаспадарка нясе пэўныя затраты на апрацоўку ўчастка, — тлумачыць кіраўнік справамі Даўгінаўскага сельскага выканаўчага камітэта Галіна Ханашчак. — Мяркую, у хуткім часе зноў вернемся да гэтай праблемы на сумесным пасяджэнні кіраўніцтва акцыянернага таварыства і выканкама.

Галіну Іванаўну я застала ў добрым настроі. І для гэтага была важкая нагода. Сельвыканкам прызнаны пераможцам раённага спаборніцтва па закупцы малака ў насельніцтва за мінулы год і ўзнагароджаны ганаровай граматай Вілейскага раённага выканаўчага камітэта з уручэннем прэміі. А жыхар вёскі Вардомічы Віктар Банкоў здаў дзяржаве 15231 кілаграм прадукцыі і заняў другое месца ў раёне. На трэцім — Часлаў Дубаневіч з Даўгінава.

Сярод маладых сем'яў у лідарах Павел і Таццяна Гаруновічы. «Вельмі працавітыя, маюць чатырох кароў, купілі даільны апарат, збіраюцца набыць электрапастух. Летась яны здалі дзяржаве 10336 кілаграмаў малака», — дзеліцца ўражаннямі прадстаўніца мясцовай улады.

Паміж скупшчыкам і «калгасам»

— Аднойчы мы з мужам асвежавалі цялё, прадаць мяса пасрэдніку адмовіліся, вырашылі збыць яго на Камароўцы. Дык там расхапалі цяляціну літаральна за дзве гадзіны, — расказвае Галіна Ханашчак. — Але калі дома падлічылі выдаткі (санітарна-ветэрынарны кантроль, плата за гандлёвае месца, халаты, дарожныя выдаткі), то аказалася, што нічога не выйгралі.

— Як ні круці, а на рынку цана вышэй. Толькі ў сельскіх жыхароў няма часу стаяць самім за прылаўкам. А раптам не раскупяць за дзень, трэба здаваць на захоўванне ў халадзільнік, дбаць пра начлег. А гэта недазваляльная раскоша: дома чакае хатняя гаспадарка. Гэтым і карыстаюцца перакупшчыкі. Словам, манапалісты на рынку. Адсюль і цэны там завоблачныя, — лічыць Віктар Ніжнік.

Часцей за ўсё гаспадары звяртаюцца па даведкі ў мясцовы выканаўчы орган бліжэй да восені, каб прадаць парсючка жывой вагой. Тады можна сабраць школьнікаў, студэнтаў на вучобу. Але апошнім часам уладальнікі ўсё больш прыходзяць да высновы, што хатнюю жывёлу лепш здаваць калектыўным гаспадаркам, паколькі тыя разлічваюцца не толькі грашыма, але і выдаткоўваюць зерне, сена, камбікорм, якія сёння каштуюць нятанна.

Вілейскі раён.

ПАДЗЯЛІЛІ «СФЕРЫ ЎПЛЫВУ»

Не так даўно прэзідыум Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў пачаў зацвярджаць базавыя напрамкі работы гарадскіх і раённых Саветаў. Гэтая форма працы прыжылася і ў Асіповіцкім раёне, дзе ў кожнага пасялковага і сельскага Савета базавых напрамкаў як мінімум два. Такі падзел «сфер уплыву» дазваляе аператыўна вывучаць і распаўсюджваць у межах раёна найбольш удалыя напрацоўкі, штоквартальна праводзіць семінары па абмене вопытам.

— Кожная наша сустрэча — гэта магчымасць «зверыць гадзіннікі», параўнаць сябе з іншымі, павучыцца, — кажа старшыня Асіповіцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Пузік.

Нядаўна абмен вопытам адбыўся на тэрыторыі Дарагануўскага сельсавета, дзе гасцям паказалі, як арганізавана работа па зберажэнні гісторыка-культурнай спадчыны. На канкрэтных прыкладах была прадэманстравана створаная ў сельсавеце сістэма ўзаемадзеяння паміж установамі, якія адказваюць за развіццё культурнага асяродку, і сельскім Саветам, каардынатарам і генератарам ідэй.

Сёння сельвыканкам разам з Радуліцкім сельскім клубам працуе над вялікім сумесным праектам — арганізацыяй сустрэчы вучняў Радуліцкай школы, якая праіснавала больш за стагоддзе і была закрыта на пачатку «нулявых» гадоў. Сустрэча выпускнікоў запланавана на ліпень, і калі ўсё атрымаецца, яна можа «вырасці» ў традыцыйнае мясцовае свята. А ў жніўні ў вёсцы Каўгары сумесна з мясцовым клубам і СВК «Калгас «Каўгарскі» будзе праведзены «Восеньскі кірмаш» — свята ўраджаю з выкарыстаннем элементаў аўтэнтычнага фальклору.

Насычанасць культурнага жыцця дае жыхарам сельсавета падставу ганарыцца сваёй малой радзімай, яе ўнікальнасцю ў маштабах цэлай краіны.

Выхаванне «местачковага патрыятызму»? Безумоўна. Ды такога моцнага, што аж зайздросна становіцца.

Дзмітрый САЎРЫЦКІ.

Информационное сообщение о ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Калюжки Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1.	Форма проведения аукциона	Открытый
2.	Дата, время и место проведения аукциона	18 мая 2012 года в 15.00, г. Жодино, пер. Молодежный, 3, Жодинский сельисполком, кабинет № 1
3.	Продавец и его адрес	Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3
4.	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	**Лот № 1** — земельный участок площадью 0,1483 га с кадастровым № 624881707601000185 в д. Калюжки. **Лот № 2** — земельный участок площадью 0,1396 га с кадастровым № 624881714801000186 в д. Калюжки. **Лот № 3** — земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым № 624881707601000187 в д. Калюжки.
5.	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6.	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания жилого дома
7.	Начальная цена продажи	**Лот № 1** — 25 000 000 рублей. **Лот № 2** — 25 000 000 рублей. **Лот № 3** — 25 000 000 рублей.
8.	Условия аукциона	-продажа по цене не ниже начальной; - участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9.	Наличие инженерной инфраструктуры	**Лот № 1** (газоснабжение, электроснабжение) **Лот № 2** (газоснабжение, электроснабжение) **Лот № 3** (газоснабжение, электроснабжение)
10.	Сумма задатка и реквизиты продавца	10% от начальной цены земельного участка, р/с 3604627020009 в филиале № 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25 «А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион»)
11.	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками	каждый четверг в 15.00
12.	Окончательный срок приема заявлений	14 мая 2012 года до 17.00
13.	Контактный телефон	8 01775 35 449, 8 01775 37 174, 8 01775 37 189

Расходы по организации и проведению аукциона (Лот № 1 — 1 955 654 рубля; **Лот № 2** — 1 603 848 рублей; **Лот № 3** — 1 955 654 рубля) **и затраты на публикацию информационного сообщения** подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.

3. Документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

«ЧЫСТАЯ» АКЦЫЯ

НЕ ЧАКАЮЧЫ «АДМАШКІ» ЗВЕРХУ

Вясной зямля не толькі абуджаецца ад зімовага сну, але і агаляе наступствы чалавечай абыякавасці і бескультур'я. Ля дарог, у прыбярэжнай зоне, у лясах, нават на зялёных лапіках гарадской рысы пасля снегу дзе-нідзе вытыркаюць вялікія і малыя гурбы адходаў, сярод якіх абсалютныя лідары — пластыкавая тара і посуд. Хапае і іншага смецця. У раўчуках і канавах можна ўбачыць нават тэлевізары. А на палетках прыгарадных гаспадарак, дзе дружна зазелянелі азімыя, рэжа вока папяровы россып. Выйсце з гэтай сітуацыі існуе адно — узяць і прыбраць. Але, на жаль, чысціня доўга не трывае. Праз некаторы час даводзіцца прыбіраць зноў...

Такія заклікі пакідалі на дрэвах пасля прыборкі.

Яшчэ напярэдадні Велікодных святаў невялікі райцэнтр Жабінка, асабліва цэнтральная яго частка, радаваў узорнай чысцінёй. Над гэтым, як расказала начальнік участка добраўпарадкавання раённай ЖКГ Марыя ВІТКОЎСКАЯ, шчыравалі 18 дворнікаў, рабочыя па добраўпарадкаванні, ды і ўвесь калектыў участка. Праведзена вялікая работа на могілках па вуліцы Камсамольскай — зрэзалі 22 аварыйныя дрэвы, прыбралі лішняе кустоўе, вывезлі гурбы смецця. Работнікі ЖКГ таксама добраўпарадкавалі могілкі вёсак Федзькавічы, Здзітава, Булькова. Не чакаючы ўказаняў зверху, яшчэ ў сакавіку ўзяліся за навядзенне парадку ў Азяцкім, Якаўчыцкім, Крыўлянскім сельсаветах... На гэтых тэрыторыях, заўважыла Марыя Віткоўская, аператыўна ліквідуюцца стыхійныя звалкі, якія, на жаль, з'яўляюцца рэгулярна. Хоць у 98 населеных пунктах раёна ўстаноўлены 282 кантэйнеры, а астатнія (як правіла, зусім невялікія) вёскі раз на тыдзень аб'язджае смеццявоз, асобныя грамадзяне ўсё ж выкідаюць бытавыя адходы, мэблю, тэхніку, будматэрыялы куды прыйдзецца. З гэтымі незаконнымі звалкамі даводзіцца змагацца, расходаваць немалыя дзяржаўныя сродкі.

У райцэнтры перакрыце абнаўленне цэлы шэраг дварою, завулкаў. А крыху пазней вуліцы ўпрыгожаць кветкамі, расаду якіх вырошчваюць ва ўласнай гаспадарцы. Гэтай вясной дзве невялікія цяпліцы паявіліся ў раённай ЖКГ. Купляць гатовую расаду становіцца дарагавата, а ўпрыгожваць горад трэба. Як яшчэ выхоўваць суайчыннікаў, калі не парадкам і прыгажосцю?

А па ініцыятыве райінспекцыі аховы прыроды 12 красавіка была арганізавана акцыя па прыбіранні найбольш папулярных месцаў адпачынку гараджан і насельнікаў раёна. Добрую справу падтрымалі ў райвыканкаме, аддзелы і службы якога таксама накіравалі сваіх людзей на прыборку — іх сіламі быў прыбраны вялікі ўчастак набярэжнай Мухаўца. Давялося лішні раз упэўніцца, што многія гараджане, калі выбіраюцца «на прыроду», не саромеюцца прыхапіць з сабой мех альбо скрыню хатняга смецця, каб тут яго пакінуць. За адзін рэйс трактар камунальнай гаспадаркі не здолеў забраць усё, што сабралі з прыбярэжнай «стометроўкі».

Смецце, якое засталося пасля пікнікоў шматлікіх кампаній, збіралі і юныя сябры прыроды. Вучні Ленінскай сярэдняй школы працавалі ў раёне рыбалоўных угоддзяў на месцы выпрацаваных тарфянікаў, недалёка ад вёскі Чыжэўшчына. Наступствы рыбалак, дарэчы, даводзіцца прыбіраць рэгулярна. На гэты раз, паводле слоў кіраўніка прыродаахоўнай інспекцыі Жабінкаўскага раёна Сяргея ШТЫКА, да «чыстай» акцыі пастараліся прыцягнуць і саміх рыбакоў, якія бавілі час у назіранні за паплаўком.

Несумненна, такія мерапрыемствы надзвычай важныя з пункту гледжання як выхавання, так і практычнай карысці. Але што рабіць, каб смецця ў навакольным асяроддзі было менш?

Вядома, усімі сіламі і сродкамі больш прыцягваць да адказнасці парушальнікаў. Але не толькі. На думку Сяргея Штыка, трэба стварацьбольш магчымасцяў для легальнай утылізацыі смецця. Заўважана, што некаторыя аматары адпачынку на прыродзе пасля пікнікоў збіраюць смецце і пакідаюць яго ў пакеце. Потым гэты пахучы мех знаходзіць бадзяжны сабака або ліса, раздзіраюць яго, вецер падхоплівае — у выніку атрымліваецца метраў дзесяць засмечанай тэрыторыі. Варта лясніцтвам, іншым землеўладальнікам заключаць дагаворы з арганізацыямі ЖКГ на рэгулярны вываз смецця з самых масавых месцаў адпачынку. Гэта наўрад ці абыдзецца даражэй, чым пастаянныя мерапрыемствы па прыбіранні.

І яшчэ падчас рэйду давялося пераканацца, як асобныя ведамствы ўмеюць неназойліва пазбаўляцца ад «лішніх» праблем. Прычым лішнімі яны становяцца неяк знянацку. Перад пунктам дарожнага збору Федзькавічы, на заходняй мяжы дзяржавы, даўно абсталявана стаянка, у тым ліку для велікагрузнага транспарту. Гэта першая стаянка ад мяжы на трасе М-1, размешчана яна каля прыпынку Пятровічы. Стаянка, як вядома, прадугледжвае наяўнасць прыбіральняў. Але пэўны час таму гаспадар трасы РУП «Белаўтастрада» з дапамогай адпаведных дакументаў і рашэнняў перавяло стаянку ў разрад пляцоўкі. На пляцоўцы прыбіральня неабавязковая. Як няцяжка здагадацца, ад санвузлоў пазбавіліся. Але ж сотні машын як ішлі праз мяжу, так і ідуць. Як спыняліся ў гэтым месцы, так і цяпер робяць прыпынак. У што ператкварыўся ўзлесак за стаянкай, апісваць не хочацца. Праўда, апошнім часам, выконваючы прадпісанне прыродаахоўнай інспекцыі, тут некалькі разоў прыбіралі леснікі. Але ж праблему гэта не вырашае...

Святлана ЯСКЕВІЧ. Фота аўтара.

Жабінкаўскі раён.

«САЛОДКАЯ ПАРАЧКА»

Ноччу ў Талачынскі РАУС звярнуўся індывідуальны прадпрымальнік, які паведаміў, што абрабавалі яго гандлёвы кіёск, размешчаны на прыпынку грамадскага транспарту па вуліцы Леніна.

Скралі кандытарскія вырабы на суму 380 тысяч рублёў. Аказалася, што кіёск «узялі» двое... За ўчыненае зладзейства затрыманы непрацуючыя мясцовыя жыхары: раней судзімы за крадзеж, 1988 года нараджэння, і раней судзімы за рабаванне, 1986 года нараджэння. Аддзелам следчага камітэта заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Закрытое акционерное общество «СОМБЕЛБАНК»

Республика Беларусь,
220030, г. Минск, ул. К. Маркса, д. 25
Телефоны: 328 65 82, 328 65 69

сомбелбанк
УСПЕХ – ЭТО ТОЛЬКО НАЧАЛО

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 апреля 2012	на 1 апреля 2011
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		82 952,2	19 921,3
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		108 169,8	81 284,1
5	Средства в банках	1104		106 584,9	20 501,1
6	Ценные бумаги	1105		50 461,2	
7	Кредиты клиентам	1106		399 342,3	196 044,5
8	Производные финансовые активы	1107		8 795,5	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		24 784,5	6 039,2
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		138,0	138,0
12	Прочие активы	1111		18 171,4	9 404,1
13	ИТОГО активы	11		799 399,8	333 332,3
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		30 345,3	63 653,9
16	Средства банков	1202		55 628,8	144,0
17	Средства клиентов	1203		507 808,8	184 843,7
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		88 598,6	-
19	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
20	Прочие обязательства	1206		3 611,5	2 654,9
21	ВСЕГО обязательства	120		685 993,0	251 296,5
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		55 322,6	55 322,6
24	Эмиссионный доход	1212			
25	Резервный фонд	1213		21 392,3	21 392,3
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		11 817,4	567,7
27	Накопленная прибыль	1215		24 874,5	4 753,2
28	ВСЕГО капитал	121		113 406,8	82 035,8
29	ИТОГО обязательства и капитал	12		799 399,8	333 332,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	на 1 апреля 2012	на 1 апреля 2011
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		35 958,3	5 205,2
2	Процентные расходы	2012		58 339,0	4 603,1
3	Чистые процентные доходы	201		(22 380,7)	602,1
4	Комиссионные доходы	2021		51 209,1	14 836,8
5	Комиссионные расходы	2022		2 139,5	1 256,9
6	Чистые комиссионные доходы	202		49 069,6	13 579,9
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		463,7	2 486,4
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		6 681,7	147,9
11	Чистые отчисления в резервы	207		3 261,6	1 535,5
12	Прочие доходы	208		1 254,8	874,3
13	Операционные расходы	209		25 101,1	10 014,2
14	Прочие расходы	210		1 680,2	418,3
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		5 046,2	5 722,6
16	Налог на прибыль	212		484,7	969,4
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		4 561,5	4 753,2

Первый заместитель Председателя Правления **Т.Л. Даниленко**

Главный бухгалтер **Е.М. Папушева**

ЗАО «Сомбелбанк», лицензия № 25 от 13.11.2008 г., выдана НБ РБ, УНП 807000122.

г. ВИТЕБСК 21.05.2012

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
2	Неиспользуемые здание заправки машин (склад ГСМ) и теплица, расположенные по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. 23-х Гвардейцев, д. 85г и 85д, и право заключения договоров аренды земельных участков.	**НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА на 50%** Характеристика объекта недвижимости: **капитальное строение с инв. № 250/С-34158** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), одноэтажное, кирпичное, общей площадью 20 кв.м, 1953 г. постройки, фундамент бутовый, перекрытия ж/бетонные плиты, крыша – асбестоцементные листы, расположено по адресу: г. Полоцк, ул. 23-х Гвардейцев, 85д; **капитальное строение с инв. № 250/С-34147** (здание специализированное ветеринарного назначения), материал стен – металлический каркас, остекление, фундамент бетонный, общая площадь – 410 кв.м, 1997 г. постройки, расположено по адресу: г. Полоцк, ул. 23-х Гвардейцев, 85г. Земельные участки: с кадастровым номером 243500000006001781, площадь 0,0164 га для содержания и обслуживания здания заправки машин, сроком аренды 25 лет. Ограничения в использовании земель – водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (река Бельчанка) площадью 0,0164 га. С кадастровым номером 243500000006001780, площадью 0,0570 га для содержания и обслуживания теплицы, сроком аренды 25 лет. Ограничения в использовании земель – водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (река Бельчанка) площадью 0,0570 га.	94 301 511	18 860 300

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ НЕДВИЖИМОСТИ: Унитарное предприятие «Полоцкая фабрика художественных изделий «София», тел. (0214) 48 87 93.

Условия предоставления земельного участка: заключение победителем аукциона договора аренды земельного участка с Полоцким горисполкомом и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок после заключения договора аренды на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства (реконструкции) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Аукцион состоится «21» мая 2012 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, а также консолидированные участники – два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования; индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к заявлению прилагаются: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 18.05.2012 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 21.05.2012 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

1. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

3. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не позднее 12 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

6. Извещения о проведении аукциона были опубликованы ранее в газете «Звяз

ТРОХБАКОВЫ АБМЕН

У Гродне эканамічны форум збярэ бізнэсоўцаў трох краін

18—19 красавіка ў Гродне пройдуць VIII Міжнародны Беларуска-Літоўскі і III Міжнародны Беларуска-Фінляндскі форумы. Абодва форумы праводзіць Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы сумесна з Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь, Гродзенскім абласным выканаўчым камітэтам, а таксама прадстаўнікамі беларускіх, літоўскіх і фінляндскіх дзелавых колаў. У сувязі з гэтым Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Літве і Фінляндыі Уладзімір Дражын правёў прэс-канферэнцыю ў Вільнюсе.

Асноўнай мэтай запланаваных форумаў, сказаў У. Дражын, з'яўляецца паглыбленне і далейшае развіццё гандлёва-эканамічнага, навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з Літвой і Фінляндыяй, дэманстрацыя эканамічнага патэнцыялу краіны, вядучых прадпрыемстваў-таваравытворцаў, пошук новых дзелавых партнёраў, умацаванне іміджу беларускіх прадпрыемстваў на замежных рынках, абмен станоўчым досведам.

Першы Беларуска-Літоўскі форум адбыўся ў 2005 г. у Клайпедзе. Пазней яны праходзілі ў Салігорску, Друскінінкаі, Мінску, Вільнюсе, Гродне і зноў у Друскінінкаі. Кожны з гэтых форумаў быў карысны для развіцця беларуска-літоўскіх эканамічных адносін. Але асабліва Уладзімір Дражын вылучыў Вільнюскі форум, які адбыўся ў 2009 г. і ў якім узяў актыўны ўдзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Гэты форум даў вельмі станоўчыя вынікі, бо на ім былі акрэслены асноўныя кірункі двухбаковага развіцця і гарантыі з боку кіраўніка дзяржавы для надзейнага інвеставання замежнага капіталу.

Дзякуючы гэтым намаганням Літва стала адным з найважнейшых гандлёвых партнёраў Рэспублікі Беларусь. А гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх краін на працягу апошніх гадоў характарызуецца ўстойлівай пазітыўнай дынамікай. Так, па выніках мінулага года, дзякуючы зладжанаму, эфектыўнаму ўзаемадзеянню бізнэс-структур Беларусі і Літвы, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, упершыню атрымалася выйсці на рэкордны двухбаковы тавараабарот у аб'ёме 1 млрд 160 млн долараў ЗША. Больш як у 2,3 раза, у параўнанні з 2010 годам, павялічыліся літоўскія інвестыцыі ў беларускую эканоміку (114,4 млн долараў), абарот паслуг склаў 550 млн долараў.

«Мы вельмі цэнім супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі. Зараз траціну таварнага абароту нашага порта складаюць грузы з Беларусі. Нас радуе, што гэты тавараабарот мае тэндэнцыю да росту», — напярэдадні Гродзенскага форуму сказаў генеральны дырэктар Клайпедскага марскога порта Яўгеніюс Гентвілас.

У апошнія гады Рэспубліка Беларусь актыўна нарошчвае маштабы супрацоўніцтва і з Фінляндскай Рэспублікай. За 2011 год дасягнуты ўзровень тавараабароту ў памеры 205 млн долараў ЗША.

Жаданне ўдзельнічаць у Гродзенскім форуме ўжо выказалі больш як 150 літоўскіх фірмаў. Прыкладна такая ж колькасць фірмаў будзе прадстаўляць і Беларусь. З Фінляндыі прыедуць прадстаўнікі 48 кампаній.

«Гэта ўжо восьмы форум, дзе будуць сустракацца літоўскія і беларускія прадпрымальнікі. Я, як і іншыя нашы калегі, з надзеяй еду ў Гродна. Дынаміка нашага супрацоўніцтва пацвярджае старую ісціну, што самыя цесныя эканамічныя сувязі бываюць у суседніх краін. Форум у Гродне цікавы і тым, што на ім будуць прысутнічаць і прадстаўнікі Фінляндыі, — перад паездкай у Гродна сказаў карэспандэнту «Звязды» прэзідэнт Канфедэрацыі прамыслоўцаў Літвы доктар Гедымін Райніс. — Месца правядзення форуму таксама ўдала выбрана. Гродна зараз з'яўляецца самым актыўным інвестыцыйным полем для літоўскіх інвестараў».

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,
уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве,
г. Вільнюс.

ФРАНСАБАНК FRANSABANK

«Франсабанк»
Открытое акционерное общество
Республика Беларусь,
г. Минск, пр. Независимости, 95А

тел.: (017) 389 36 36,
факс: (017) 389 36 37
office@fransabank.by
www.fransabank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	на 01.01.2012 года	на 01.01.2011 года
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	5.1.	34 593,0	16 369,6
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	5.2.	109 593,0	72 682,5
5	Средства в банках	1104	5.3.	102 320,7	24 561,3
6	Ценные бумаги	1105	5.4.	25 578,8	33 244,7
7	Кредиты клиентам	1106	5.5	161 217,4	118 819,6
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	5.6.	0,8	0,8
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	5.7.	100 077,1	49 210,9
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		-	-
12	Прочие активы	1111	5.8.	2 248,2	1 485,2
13	Итого активы	11		535 629,0	316 374,6
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201	5.9.	38 295,7	66 751,5
16	Средства банков	1202	5.10.	196 910,8	72 084,7
17	Средства клиентов	1203	5.11.	105 988,7	83 083,0
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	5.12.	12 080,5	-
19	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
20	Прочие обязательства	1206	5.13.	6 546,5	772,1
21	ВСЕГО обязательства	120		359 822,2	222 691,3
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211	5.14.	67 785,2	67 785,2
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213	5.15.	3 389,3	3 389,3
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	5.16.	52 639,6	2 669,0
27	Накопленная прибыль	1215	5.17.	51 992,7	19 839,8
28	ВСЕГО капитал	121		175 806,8	93 683,3
29	Итого обязательства и капитал	12		535 629,0	316 374,6

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2011 год	2010 год
1	2	3	4	5	6
